❑ *«Мяне за тое, што я расказаў, не расстраляюць»?* 1-я стар.

❑ *Чатыры тысячы іншаземцаў атрымалі сёлета від на жыхарства ў Беларусі.* 1-я стар.

❑ *Валерый Ціхіня: «Канстытуцыйны суд — апора прававой дзяржавы».* 2-я стар.

❑ *Прыгарадныя аўтобусы падаражаюць.* 1-я стар.

ЗВЯЗДА

15 мая 1996 г. серада, № 118 (22921)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

РОЗГАЛАС

АЛЕ ЗАТОЕ МЫ ПА БАЛЕТУ НАПЕРАДЗЕ ПЛАНЕТЫ ЎСЁЙ

З віншаванняў і ўручэння кветак пачалася 13 мая сустрэча Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі Сямёна Шарэцкага з народным артыстам СССР Валянцінам Елізар'евым і выканаўцамі галоўных роляў у спектаклі «Страсці» («Рагнеда») народнай артысткай Беларусі Інесай Душкевіч, заслужаным артыстам рэспублікі Веніямінам Захаравым, Святланай Гарбуновай і Уладзімірам Далгіх. Менавіта за гэту пастаноўку мастацкану кіраўніку балета беларускага ДАВТа Валянціну Елізар'еву была нядаўна прысуджана ў Парыжы вышэйшая ўзнагарода Міжнароднай асацыяцыі дзеячаў харэаграфіі «Бенуа дэ ля данс» за лепшую харэаграфію ў сусветным балетным мастацтве ў 1996 годзе. Акрамя асабістых віншаванняў спікер парламента перадаў Валянціну Елізар'еву прывітальны адрас ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета.

Віктар КУКЛОЎ, БЕЛТА.

АБЛІГАЦЫІ ДЗЯРЖАЎНАЙ МЭТАВАЙ БЕСПРАЦЭНТНАЙ ПАЗЫКІ: ЦІ БУДЗЕ ПРЫНЯТА РАШЭННЕ?..

Мусіць, няшмат знойдзецца людзей, якія сочаць за падзеямі вакол абясцэненых укладаў, вырашэннем пытанняў па аблігацыях дзяржаўнай мэтавай беспрацэнтнай пазыкі 1990 года. Шмат слоў, аднак справа з месца пакуль не зрушылася. Зразумела, гэта ніякім чынам не задавальняе пацярпеўшых. Лішні таму доказ — сход, які адбыўся ў мінулую нядзелю ў Мінску, на якім прысутнічалі ўладальнікі аблігацый дзяржаўнай мэтавай беспрацэнтнай пазыкі 1990 года на набыццё тавараў працяглага карыстання. На ім, дарэчы, прысутнічалі больш як 500 чалавек практычна з усіх рэгіёнаў Беларусі (па рэспубліцы налічваецца каля 78,5 тысячы такіх грамадзян).

Арганізатарамі сходу па ініцыятыве грамадзян выступілі дэпутат Вярхоўнага Савета Віктар Цярэшчанка і старшыня ініцыятыўнай групы Аляксандр Самадураў. Яны праінфармавалі прысутных аб праробленай імі працы і шляхах канстытуцыйнага вырашэння праблемы выканання дзяржавай сваіх пазыковых абавязацельстваў.

Вынікам сходу стаў зварот удзельнікаў да Прэзідэнта Беларусі з просьбай аб прыняцці рашэння па выкананню абавязацельстваў дзяржаўнай пазыкі 1990 года і ўзбуджэнні крымінальных спраў па фактах нанясення ўрону шляхам падману і злоўжывання даверам па артыкулу 92 Крымінальнага кодэкса і злоўжывання ўладай — па артыкулу 166. Падобны зварот прыняты і да Вярхоўнага Савета з просьбай аб уключэнні ў парадак дня першай сесіі Вярхоўнага Савета XIII склікання пытання аб прыняцці закона «Аб выкананні абавязацельстваў па дзяржаўнай мэтавай беспрацэнтнай пазыцы 1990 года». У звароце да Генеральнага пракурора ўдзельнікі выклалі факты процідпраўных дзеянняў былога ўрада і выказалі просьбу аб узбуджэнні крымінальных спраў па гэтых фактах.

Дададзім, што на сходзе быў разгледжаны і адобраны праект закона «Аб выкананні абавязацельстваў па дзяржаўнай мэтавай беспрацэнтнай пазыцы 1990 года», распрацаваны дэпутатам Віктарам Цярэшчанкам.

Ігар ГРЫШЫН.

УЛЕТКУ ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ...

Адмовіцца ад практыкі летніх калектыўных водпускаў заклікаў кіраўнікоў прадпрыемстваў старшыня Віцебскага аблвыканкома Уладзімір Андрэйчанка.

Летнія месяцы, лічыць ён, павінны быць выкарыстаны як мага больш прадукцыйна, бо выпуск прадукцыі ўлетку абыходзіцца танней з-за змяншэння затрат на асвятленне і ацяпленне.

Крыху раней аблвыканком забараніў адміністрацыі прадпрыемстваў без узгаднення з уладамі скарачэнне работнікаў. Пастаўлена задача разам з тым зменшыць і страты рабочага часу. А за мінулы год яны склалі 4,3 мільёна чалавека-дзён, або 16 працэнтаў усяго табельнага часу, і ўзраслі ў 1,7 раза. Гэта раўназначна нявырабу прадукцыі на 2,5 трыльёна рублёў.

Паліна АЛЯКСАНДРАВА.

ПРЫГАРАДНЫ ПРАЕЗД У АЎТОБУСАХ У ЧЭРВЕНІ ПАДАРАЖЭЕ

Толькі «Звязда» паведаміла аб змяненнях тарыфаў на прыгарадныя аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у сувязі з дачным сезонам, як прыйшла яшчэ адна навіна на гэтую ж тэму.

У адпаведнасці з рэкамендацыямі Камітэта цэн Міністэрства эканомікі краіны дадзены дазвол гарадскім упраўленням транспарту на павышэнне з чэрвеня кошту прыгарадных перавозак да 200 і 220 рублёў за кіламетр праезду адпаведна ў машынах агульнага тыпу і ў аўтобусах з мяккімі сядзеннямі. Зразумела, рэкамендацыі яшчэ не азначаюць, што будуць устаноўлены менавіта такія тарыфы, і неабавязкова з 1 чэрвеня. З іншага боку, улічваючы мінусавую рэнтабельнасць работы транспартнікаў, гэтая мера, на жаль, у рэшце рэшт непазбежная. Можна зразумець пачуцці тых людзей, каму гэтае рашэнне «б'е» па кішэні, але, аддаючы належнае, хацелася б заўважыць, што работнікі транспарту ніколі не злоўжывалі (калі можна так сказаць) сваім правам на павелічэнне тарыфаў, цярпячы ад гэтага, між іншым, вялікія страты.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВІД НА ЖЫХАРСТВА Ў БЕЛАРУСІ АТРЫМАЛІ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ЧАТЫРЫ ТЫСЯЧЫ ІНШАЗЕМЦАЎ

Паводле звестак БелаПАН, з пачатку 1996 года чатыры тысячы замежных грамадзян атрымалі дазвол на права жыхарства ў Беларусі. У асноўным гэта выхадцы з блізкага замежжа.

У мінулым годзе такі дазвол быў дадзены амаль 14 тысячам іншаземцаў. Гэта прыблізна столькі ж, колькі і ў 1994 годзе. У аддзеле віз і рэгістрацыі МУС рэспублікі растлумачылі, што тэндэнцыі да значнага росту гэтай катэгорыі грамадзян не назіраецца. Адна з прычын гэтага — даволі жорсткае заканадаўства рэспублікі ў адносінах да дазволаў на прадастаўленне права на жыхарства. Аднак многія іншаземцы не трацяць надзеі атрымаць беларускае грамадзянства. У мінулым годзе грамадзянамі рэспублікі сталі 20 тысяч чалавек, якія раней пражывалі на яе тэрыторыі.

Святлана ЮЗІК, БелаПАН.

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

№ 172

Аб устанаўленні свята — Дня фізічнай культуры і спорту

Устанавіць у Рэспубліцы Беларусь свята — Дзень фізічнай культуры і спорту і штогод адзначаць яго ў трэцюю суботу мая.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

14 мая 1996 г., г. Мінск.

Арганізацыя прадае:

аўтамабілі МАЗ

рухавікі ММЗ

Д-243-91
Д-243-94
Д-245-20

Тэлефон (0172) 308-785

НАДЗВЫЧАЙНЫЯ ЗДАРЭННІ НА ВЫТВОРЧАСЦІ: ДОБРАЯ ТЭНДЭНЦЫЯ ПАД ПЫТАННЕМ?

Як паведамілі нашаму карэспандэнту ў аддзеле інфармацыйна-аналітычнай работы інспекцыі працы, за першыя чатыры месяцы бягучага года ў краіне пры выкананні службовых абавязкаў загінулі 84 чалавекі. Для роздуму: летась за студзень—красавік была меншая колькасць смерцяў на вытворчасці — 81 выпадак.

Статыстыка сведчыць, што за апошнія гады тэндэнцыя да змяншэння колькасці надзвычайных здарэнняў на вытворчасці стала відавочная. Так, калі ў 1993 годзе было зарэгістравана 18.512 вытворчых траўмаў, то ў 1995-м — 13.027; калі тры гады таму было 408 смяротных выпадкаў, то летась — 349. Аднак час, відаць, пачынае ўносіць сумныя карэктывы. І далёка не апошняя прычына таму, на думку супрацоўнікаў Міністэрства працы, у скарачэнні на шмат якіх прадпрыемствах краіны штатных адзінак інжынераў па тэхніцы бяспекі. Цікава, што адміністрацыі пры гэтым дзейнічаюць у рамках існуючага працоўнага заканадаўства, тады як прыняцце ў другім чытанні Закона аб ахове працы Вярхоўным Саветам адкладзена на няпэўны час.

Сяргей ГРЫБ.

ЖЫВЁЛА ДОХНЕ, А Ў СПРАВАЗДАЧАХ — ПОЎНЫ АЖУР

Учора калегія Пракуратуры Рэспублікі Беларусь разгледзела пытанне аб стане законнасці ў аграпрамысловым комплексе. Праведзеныя напярэдадні органамі пракуратуры праверкі выканання заканадаўства аб ахове жывёлы, захавання матэрыяльна-тэхнічных і фінансава-крэдытных рэсурсаў у калгасах, саўгасах і іншых сельгаспрадпрыемствах паказалі, што ў многіх гаспадарках дапушчаны сур'ёзныя парушэнні. Аграпрамысловы комплекс і ў цэлым эканоміка краіны нясе велізарныя страты ад гібелі жывёлы, марнатраўства, безгаспадарчасці і крадзяжу.

На нездавальняючым узроўні знаходзіцца першасны ўлік пагалоўя жывёлы і прадукцыі жывёлагадоўлі: у актах на прыплод, у кнігах уліку руху жывёлы дапускаюцца падчысткі і выпраўленні, адсутнічаюць неабходныя звесткі... Нярэдка загадчыкі фермаў хаваюць ад уліку падзеж, дапускаюць прыпіскі прыраст жывёлы, што ў сваю чаргу садзейнічае крадзяжам. Так, згодна са справаздачай калгаса «Мсціслаўскі» Мсціслаўскага раёна за 1995 год падзеж буйной рагатай жывёлы склаў быццам бы ўсяго 15 галоў. Хоць толькі за адзін месяц з-за пагрозы гібелі жывёлы там было выбракавана і адпраўлена пад нож 106 галоў. У выніку страты перавысілі 68 мільёнаў рублёў. Пракурорам раёна ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да старшыні калгаса Г. Шарснёва, галоўнага заатэхніка Г. Якімовіча, галоўнага ветурача Н. Катушкіна, начальніка жывёлагадоўчага комплексу Н. Лазарэнка.

У снежні 1995 года пры праверцы комплексу «Асінаўскі» Чавускага раёна была выяўлена нястача 28 галоў буйной рагатай жывёлы на 113 мільёнаў рублёў, а на ферме саўгаса «Трамлянскі» Калінкавіцкага раёна недалічыліся ажно 406 галоў жывёлы на 784,4 мільёна рублёў. Пракуроры па гэтых фактах узбудзілі крымінальныя справы.

У выніку недахопаў у рабоце зааветэрынарных спецыялістаў калгаса «Гвардыя» Дзятлаўскага раёна загінула звыш 10 тысяч свіней і 413 галоў буйной рагатай жывёлы. Страты тут наогул цяжка падлічыць. Пракуратура раёна таксама ўзбудзіла крымінальную справу.

Што і казаць, злавесная статыстыка ўсеагульнага марнатраўства. Але яшчэ больш небяспечны размах набылі крадзяжы ў калгасах і саўгасах. Больш падрабязна пра гэта раскажам у бліжэйшых нумарах «Звязды».

Уладзімір ГОЙТАН.

УДЗЕЛЬНІКАМ СУСТРЭЧЫ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Дарагія сябры!

Сардэчна вітаю на беларускай зямлі ўдзельнікаў сустрэчы прафесіянальных саюзаў Беларусі і Расіі.

Шматвекавая гісторыя пераканаўча сведчыць, што толькі ў яднанні нашы краіны дабіваліся росквіту, пераадольвалі самыя цяжкія выпрабаванні.

У перыяд паглыблення інтэграцыі, рэфарміравання эканомікі, накіраванага на павышэнне яе эфектыўнасці, паляпшэнне дабрабыту насельніцтва, намнога ўзрастае значнасць прафсаюзаў, прызначаных абараняць сацыяльна-эканамічныя правы людзей працы.

Вы дапамагаеце працоўным захоўваць рабочыя месцы, атрымліваць дастойную аплату працы.

Гэты год — год 10-годдзя аварыі на Чарнобыльскай АЭС, ад якой больш за ўсё пацярпелі народы нашых краін. У сувязі з гэтым вельмі важна ўмацаваць узаемадзеянне дзяржаўных органаў, прафсаюзаў у вырашэнні агульных праблем, звязаных з вынікамі катастрофы.

Мы зацікаўлены ў сацыяльным партнёрстве з моцнымі прафесіянальнымі саюзамі, якія дзейнічалі б канструктыўна і адказна ў інтарэсах нашых народаў і стабільнасці ў дзяржавах.

Спадзяюся, што ваша сустрэча будзе садзейнічаць далейшаму развіццю адносінаў паміж прафсаюзамі Беларусі і Расіі, іншых краін — удзельніц СНД, працэсу збліжэння народаў.

Моцнага вам здароўя, шчасця і паспяховай работы.

А.ЛУКАШЭНКА.

«ГАРАЧЫ ТЭЛЕФОН»

ТРЫВОЖЫЦЦА МАЦІ: ЗА ШТО, ЗА ЯКІЯ ГРОШЫ КАРМІЦЬ ДЗЯЦЕЙ?

Большасць званкоў па «гарачым тэлефоне» «Звязды» — 68-28-72 — апошнім часам сведчыць пра асаблівую жаночую, мацярынскую трывогу.

Пазваніла прыбіральшчыца з Венькаўскай сярэдняй школы (Пакрашаўскі сельсавет Слуцкага раёна). Не прадставілася. Але сказала пра сябе — маці пяцярых дзяцей. Зарплату за сакавік не атрымала. Настаўнікі атрымалі — ім выплачвае РАНА. А вось прыбіральшчыцам павінен плаціць сельсавет. Няма грошай! Чым карміць дзяцей? Пытаецца пра гэта маці, жанчына. Пытаемся і мы: «Як быць той маці далей?»

З калгаса «Пралетарый» Капыльскага раёна пазваніла Наталля Францаўна Рымашэўская. Працуе ў паляводчай брыгадзе. Зарплату не атрымлівае з лютага. Як і яе калегі па рабоце. Цікавімся, чым жа тлумачыць гэта калгаснае начальства, ці ім ужо і пытанне такое баяцца задаць. Гаворыць Наталля Францаўна, што задавалі. Толькі вось начальства тое і рот радавым працаўнікам не дае адкрыць. Маўляў, вы працуйце. А зарплату, выходзіць, пачакайце... Вось і чакаюць. За што толькі, пытаецца Наталля Францаўна, дзяцей карміць?

І ўсё гэта адбываецца ў той час, як кіраўніцтва краіны неаднойчы ставіла пытанне аб пагашэнні запазычанасці па зарплаце. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даручыў пад асабістую адказнасць прыняць неабходныя меры па пагашэнню запазычанасці, у тым ліку за І квартал — да 20 мая 1996 г., і аб выкананні далажыць. Можа, гэты востры напамінак, выкладзены ў тэлеграме Прэзідэнта прэм'ер-міністру, міністрам, кіраўнікам іншых цэнтральных органаў кіравання, кіраўнікам асобных аб'яднанняў і прадпрыемстваў, нешта зрушыць з месца? Напрыклад, на гомельскім аб'яднанні «Крышталь», адкуль нам паведамілі, што большасць рабочых не атрымлівала зарплату яшчэ за сакавік.

Пра пенсіянераў. Можна толькі здагадвацца, за што і як большасць з іх жыве. Бо нярэдка не плацяць у час не толькі зарплату, але і пенсію. Як, напрыклад, у Вілейскім раёне. Адтуль, з вёскі Талуць, з калгаса «Чырвоны сцяг», пазваніў Анатоль Мікалаевіч Троіцкі. За красавік дзесяткі пенсіянераў не атрымалі пенсіі. Пэўна ж, і ветэраны вайны ёсць сярод гэтых людзей. Крыўдна! Балюча! Соромна!

З Мядзельскага раёна з калгаса імя Максіма Горкага (вось парадоксы! З калгаса з такім імем — самы горкі і балючы званок), дазванілася Галіна Браніславаўна Мароз, інвалід І групы (з дзяцінства). Не атрымлівае пенсію з раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння, пачынаючы з красавіка. Муж — таксама інвалід І групы. На кормаўборачным камбайне яму, Леаніду Іосіфавічу, адрэзала нагу. 60 працэнтаў пенсіі былому калгасніку павінны выплачваць у калгасе. Не выплачваюць вось ужо тры месяцы. Ёсць у Марозаў і пяцігадовае дзіця. Так, двое бацькоў-інвалідаў і дзіця... Зараз трэба саджаць бульбу. А Марозы не ведаюць, чым і расплачвацца з людзьмі, з тым жа калгасам будуць. Пасля Галіны Браніславаўны трубку ўзяла Ірына Кунавіч. Адтуль жа. І яна — таксама інвалід. І ёй пенсію ў 300 тысяч рублёў таксама затрымліваюць.

Нам часцей звоняць з вёскі. Здавалася б, вясковыя людзі ў большай ступені цярплівыя, маўклівыя, стрыманыя. Ды ўжо, відаць, цярпенне не хапае.

Званіце! «Гарачы тэлефон» «Звязды» — 68-28-72. Акрамя таго, што мы збіраемся ўсіх вас выслухаць, пытанні наконт запазычанасці і нявыплат мы збіраемся задаваць і ў калідорах улады. Сачыце за старонкамі «Звязды».

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

АФІЦЫЙНА

У КАБІНЕЦЕ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Кабінет Міністраў у мэтах скарачэння запазычанасці юрыдычных асоб за газ і іншыя энерганосьбіты прыняў пастанову аб выключэнні з саставу аб'ектаў падаткаабкладання сум вэксаляў, атрыманых па разліках са спажыўцамі газу і іншых энерганосьбітаў.

Указанай пастановай дазволена прадпрыемствам, што атрымалі вэксалі, выпушчаныя Банкам знешнеэканамічнай дзейнасці ў адпаведнасці з пастановай Кабінета Міністраў і Нацыянальнага банка ад 18 сакавіка 1996 г. № 192/1, па разліках са спажыўцамі газу і іншых энерганосьбітаў, выключаць суму вэксаля з саставу аб'ектаў абкладання падаткамі на прыбытак, на дабаўленую вартасць, на паліва, акцызамі, а таксама пры разліку адлічэнняў у рэспубліканскі пазабюджэтны фонд вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, адлічэнняў у пазабюджэтныя фонды для фінансавання расходаў на ўтрыманне ведамаснага жылога фонду, адлічэнняў у дарожны фонд сродкаў карыстальнікамі аўтамабільных дарог.

* * *

Кабінет Міністраў у мэтах прадухілення далейшага спаду геолагаразведачных работ і вырашэння першачарговых задач па развіццю мінеральна-сыравіннай базы прыняў адпаведную пастанову.

У ёй вызначаны асноўныя напрамкі геолагаразведачных работ. Гэта, перш за ўсё, пошук і разведка радовішчаў нафты і газу ў мэтах падтрымання дасягнутага ўзроўню здабычы нафты. Пошук і падрыхтоўка да прамысловага асваення запасаў бурых вугалёў у якасці энергетычнага і бытавога паліва.

Ацэнка плошчаў, перспектыўных на выяўленне алмазаў, і пошукі новых крыніц іх радовішчаў.

Разведка запасаў жалезных руд для стварэння ўласнай сыравіннай базы металургічнай вытворчасці.

У гэты пералік таксама ўваходзіць падрыхтоўка да прамысловага асваення высокамінералізаваных расолаў у якасці сыравіны для атрымання ёду, брому і іншых элементаў, а таксама для выкарыстання ў будаўніцтве, сельскай гаспадарцы і іншых галінах.

Пошук і разведка новых радовішчаў мясцовых карысных выкапняў узамен імпартуемых у рэспубліку мінеральных рэсурсаў.

У прынятай пастанове таксама зроблены шэраг даручэнняў. Так, Міністэрству прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя даручана сумесна з міністэрствамі эканомікі і фінансаў, Акадэміяй навук Беларусі і іншымі зацікаўленымі ў 3-месячны тэрмін удакладніць Праграму паскарэння геолагаразведачных работ і развіцця мінеральна-сыравіннай базы нашай рэспублікі на 1993—1995 гады і на перыяд да 2000 года. Гэта праграма, як вядома, была ў асноўным адобрана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 1993 г. № 53. Удакладнены варыянт яе неабходна ва ўстаноўленым парадку прадставіць у Кабінет Міністраў.

Таму ж Міністэрству прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя таксама неабходна ў 3-месячны тэрмін правесці работу па арганізацыі ў рэспубліцы дзяржаўнага геалагічнага кантролю, а па пытаннях, якія патрабуюць рашэння ўрада, ва ўстаноўленым парадку ўнесці прапановы ў Кабінет Міністраў.

Адначасова прынята прапанова гэтага ж міністэрства, узгодненая з міністэрствамі эканомікі, фінансаў і Беларускім дзяржаўным канцэрнам па нафце і нафтапрадуктах, аб прадастаўленні вытворчаму аб'яднанню «Беларусьгеалогія» права на рэалізацыю ва ўстаноўленым парадку нафты, здабываемай пры выпрабаванні і пробнай эксплуатацыі пошукавых і разведачных свідравін пры разведцы радовішчаў, нафтаперапрацоўчым прадпрыемствам і іншым суб'ектам гаспадарання рэспублікі і накіраванне атрыманых ад гэтага сродкаў на частковае тэхнічнае пераўзбраенне геолагаразведачных работ, а таксама права на выкарыстанне ўказанай нафты і атрыманых з яе нафтапрадуктаў для ўласных вытворча-тэхналагічных патрэб.

У пастанове Міністэрству адукацыі і навукі сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя дадзена даручэнне забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў у галіне геалогіі.

Прэс-служба Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь — БЕЛТА.

ДАЎГІ НАШЫ ЖАЛОБНЫЯ

КАЛІ МЁРТВЫЯ ПЛАЧУЦЬ — ГЭТА СТРАШНА...

Жудасная тайна Кайдасавай гары

Раніца апошняга дня сумнага чэрвеня 1941 года. З непрыемным скрыпам тармазоў крытыя нямецкія грузавікі спыніліся ля падножжа Кайдасавай гары. Пачуліся зычныя каманды, затым адрывіста злосна застракатаў кулямёт... Праз паўгадзіны ўсё сціхла.

Уздымаючы густыя клубы пылу, фыркаючы на ўзгорках, змрочныя армейскія ўсюдыходы паехалі ў бок ахопленага агнём Мінска.

Чатырнаццацігадовы Васіль Мялешка, якога падганяла вечная дзіцячая цікаўнасць, разам з дзецьмі з бліжэйшых хутароў паімчаў на месца, дзе яшчэ некалькі хвілін назад грымелі стрэлы. Убачанае там і сёння, амаль праз пяцьдзесят пяць гадоў, болем сціскае сэрца Васіля Сяргеевіча, а тады, у сорак першым, у хлопчыкаў валасы сталі дуба ад жаху: на дне выкапанай яшчэ да вайны канавы вадавода варушылася зямля, здавалася, яшчэ цякла і кроў. З глыбіні даносіліся прыглушаныя стогны...

Так пачаў дзейнічаць жудасны канвеер смерці ля Кайдасавай гары пад Мінскам. Фашысты толькі захапілі сталіцу нашай роднай Беларусі і адразу ж, з першых дзён, палілася кроў безабаронных і ў большасці сваёй зусім нявінных хвяр. Ды і пры чым тут віна? Былі каты — значыць будуць і ахвяры...

Паўтара месяца, штодзённа, з нямецкай педантычнасцю, роўна ў чатыры гадзіны раніцы гулі маторы грузавікоў і заліваліся, здавалася, у бясконцым, жудасным, невыносным рогаце кулямёты. Слой за слоем «пяклі» страшны пірог з чалавечых целаў гітлераўскія каты, слой за слоем...

Больш як 10 тысяч жыхароў Мінска і ваеннапалонных з канцлагера «Дразды» былі знішчаны тут фашыстамі, больш як 10000! Удумайцеся ў гэту лічбу. Магчыма, сярод 27 мільёнаў загінуўшых для кагосьці гэта і кропля, нязначная лічба на гіганцкім рахунку крывавай Вялікай Айчыннай. Але дзесяць тысяч... Сэрца халадзее ад усведамлення жаху, жаху гэтай трагедыі.

Ды не півам баварскім, зусім не півам паілі беларусаў «вызваліцелі», а крупаўскай сталлю і свінцом, усіх, без разбору, і гэтага «напою» яны не шкадавалі... А затым, абмакнуўшы пяро ў кроў сваіх ахвяр, пісалі «загады» наконт далучэння «дзікага і адсталага беларускага народа» да еўрапейскай цывілізацыі. Крывёю пісалі, хоць і на беларускай мове, але крывёю — Беларутэнія. Гэтым словам было сказана ўсё.

Са сведкам жудаснай трагедыі ля Кайдасавай гары Васілём Сяргеевічам Мялешкам, я пазнаёміўся зусім выпадкова — калі прыехаў разам з супрацоўнікам упраўлення па ўвекавечванню памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў МА Рэспублікі Беларусь Мікалаем Трыбянком на мяркуемае месца расстрэлу. Нашу ўвагу прыцягнуў пажылы чалавек, які майстраваў плот ля свайго вясковага дома. Разгаварыліся. Вось дык удача! Бог паслаў нам чалавека, які бачыў усё на свае вочы, усё...

— Так, ідзём, хлопцы, я вам усё на месцы пакажу. Гэта недалёка — кіламетра паўтара, не болей. А вось, бачыце, помнік стаіць? Няма там нічога і ніколі не было — ні лагера, ні расстрэлаў. Як бародаўка тырчыць. Грэх, можа, так гаварыць, ды не тое месца. Крыўдна, ды і не спытаў ніхто, я паказаў бы. Вы ж першыя, хто спытаў. Раней ніхто не пытаўся, не шукаў. Усе пяцьдзесят пяць гадоў. А самому неяк і боязна нават, прызнаюся, іншы раз было ад ведання гэтага.

Мы няспешна крочылі па распаленым, пыльным, такім жа, як і ў тым сорак першым, прасёлку. Васіль Сяргеевіч, забыўшы ад хвалявання, што ў руках малаток і нажоўка, так і ішоў, сціснуўшымі іх пабялелымі пальцамі, цяжка дыхаючы і як бы апасаючыся чагосьці побач, і напаўголасу вёў свой сумны расказ.

— Вазілі іх вось па гэтай дарозе ў закрытых грузавіках. Мы бегалі глядзець. Роў быў метры 3—4 шырынёй і два з паловай глыбінёй. Расстраляных немцы прысыпалі тонкім слоем зямлі, таму кроў, як на школьных прамакашках, праступала чырвонымі плямамі, а людзі варушыліся — яшчэ жывыя былі... Аднойчы Павел Казлоўскі, наш таварыш, крыху запазніўся, а тут новую партыю на расстрэл прывезлі. Немцы схапілі яго і ў роў. Як ён крычаў, плакаў, хрысціўся, прасіўся! Неяк выратаваўся. Можа, у немца карабін асечку даў, не ведаю. Але больш мы не бегалі туды — баяліся, што заб'юць. А Павел Казлоўскі пасля вайны куды толькі не звяртаўся — усё хацеў паказаць, дзе забітыя ляжаць, усё дарэмна. А ў мяне ніхто і не пытаўся, ды і страшна было. Ну ды вось і прыйшлі. Тут ён, роў-магіла, тут і шукайце. Яны неглыбока, няшчасныя, ляжаць, неглыбока. Усё, не магу больш, пайшоў я адсюль. Шукайце. Трэба ім помнік тут паставіць, а то, бачыце, якая гара смецця.

Ён замаўчаў, паправіў запацелыя, з тоўстымі лінзамі акуляры і сказаў усхваляваным голасам, збянтэжана гледзячы кудысьці ў бок, словы, якія проста ўзрушылі мяне.

— Мяне за тое, што я расказаў, не расстраляюць?

Божа мой! Чалавек 55 гадоў насіў у сабе тайну, 55 гадоў! Але так да гэтага часу той жах і страх жывуць, жывуць у яго сэрцы! Дарагі наш Васіль Сяргеевіч, дарагія нашы бацькі, маці, дзядулі і бабулі, што ж вам давялося перажыць?!

Але тады знайсці роў-магілу не ўдалося. І вось нядаўна, у час земляных работ, ваеннаслужачы Алег Мікалаевіч Бабакоў выявіў невядомае пахаванне. Па выкліку на месца

страшнай знаходкі, выехалі салдаты пошукавай роты асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны рэспублікі. (Адзінае, дарэчы, у свеце воінскае падраздзяленне такога роду.)

Ужо першыя раскопы паказалі, што пахаваныя пад неглыбокім слоем зямлі людзі — ахвяры расстрэлаў, колькасць іх невядома. Жывы сведка расстрэлаў, Васіль Сяргеевіч Мялешка, раней паказаў, што менавіта тут знаходзіцца той самы роў-магіла.

7 мая, калі салдаты пошукавай групы пад камандаваннем старшага лейтэнанта Ігара Карповіча пачалі раскопкі на месцы трагедыі, пайшоў нудны халодны дождж. Кроплі яго выбівалі жудасную чачотку на чарапах вызваленых ад зямлі астанкаў людзей, з пустых глазніц, быццам слёзы, цяклі струменьчыкі вады. Плачучыя чарапы... Не дай Бог бачыць гэта. Гэта страшна, калі плачуць мёртвыя.

Увесь час лавіў сябе на думцы, што гэта ж ляжаць нашы Алесі, Антоны, Іваны, Мікалаі, Максімы, ляжаць нашы браткі—беларусы, рускія, украінцы, яўрэі, армяне... Ляжаць пяцьдзесят пяць гадоў, невядомыя ляжаць.

Чаму невядомыя?..

Дождж узмацняўся, але салдаты працягвалі капаць: трэба было знайсці межы рова, дакладна абазначыць, каб ужо ніхто і ніколі не патрывожыў прах загінуўшых, каб, нарэшце, па-людску ўладкаваць гэту гіганцкую магілу. На тое, што трэба спяшацца, указвала і ў нейкай сотні метраў вялізная звалка смецця, што з кожным днём бязлітасна пажырала зямлю метр за метрам. Трэба было спяшацца.

Мяркуючы па знойдзеных у ходзе раскопак шматлікіх рэштках абутку, большасць расстраляных — цывільнае насельніцтва. Мне чамусьці асабліва кінуліся ў вочы добра захаваныя светла-карычневыя скураныя чаравікі з акуратна завязанымі шнуркамі, але больш за ўсё ўзрушыў знойдзены ў кішэні няшчаснага ключ ад англійскага замка ўваходных дзвярэй кватэры. Чалавека, відаць, схапілі прама на вуліцы і, кінуўшы ў грузавік, расстралялі. Ключы навечна засталіся з гаспадаром. Трапляліся расчоскі з савецкай маркіроўкай, кашалькі — пустыя або з манетамі-медзякамі. Гільзы ад нямецкага кулямёта, страшныя гільзы — гільзы патронаў, якімі забілі людзей. Жудасна...

Ля астанкаў, на схіле рова-магілы, салдаты пошукавай групы знайшлі нямецкую бутэльку з недапітым шнапсам, закрытую спецыяльнай накрыўкай з металічнымі кранштэйнамі — (цывілізацыя), бляшанку з-пад нямецкіх кансерваў. Каты былі з моцнымі нервамі — закусвалі тут жа, не грэбуючы, у перапынках паміж расстрэламі... Падумалася: дзе ж яны цяпер? У зямельцы сырой ці дзе-небудзь у Гамбургу ці Брэмене пішуць мемуары аб подзвігах на Усходзе або ездзяць да нас турыстамі?

Дождж ліў як з вядра, але салдаты, быццам не заўважаючы яго, працягвалі працаваць. Углядваўся ў іх сканцэнтраваныя, сур'ёзныя твары. Аб чым яны думалі ў тыя хвіліны? Магчыма, як і я, перш за ўсё аб тым, чаму гэтыя дзесяць тысяч няшчасных пяцьдзесят пяць гадоў забытыя... Чаму?.. Штосьці ў гэтым страшным 55-гадовым «юбілеі» ёсць такое, што і словамі не выказаць. Быццам разышлася зямля, і вязні рова ля Кайдасавай гары вырваліся на свет Божы, каб у апошні раз пракрычаць маўклівым ротам чарапоў:

— Браткі-беларусы, мы тут, мы не зніклі бясследна! Нам балюча, што пра нас забыліся! Нам балюча, калі нас засыпаюць смеццем і ціснуць бульдозерамі! Нам балюча! Балюча!

Пракрычаць нам, нам — сваім нашчадкам!

І заплакаць, заплакаць жудаснымі дажджавымі слязамі з пустых вачніц. Мёртвыя плачуць. Гэта страшна...

Дождж ліў не перастаючы. Я ішоў не разбіраючы дарогі да бліжэйшага прыпынку аўтобуса. Побач ішло сваім парадкам звычайнае жыццё: гараджане садзілі на схілах узгоркаў агароды. А ўсяго ў сотні метраў ад іх у зямлі — страшны «пасеў» гітлераўскіх катаў, «пасеў» сорак першага года.

Як у сне сеў у аўтобус. Усяго некалькі прыпынкаў — і цэнтр горада. Божа, чаму ж мы ішлі да іх так доўга — пяцьдзесят пяць гадоў...

Не супакоены іх прах. Не павінна быць і нам усім спакою. Можа, і жывём таму так цяжка, сумна і бесправетна, што кінулі іх, здрадзілі... І глядзяць яны цяпер на нас з нябёс з болем і дакорам. Ва ўтульным свеце сваіх кватэр вы адчуваеце іх погляд? Адчуваеце?

Нават у святочны дзень чыйсьці ціхі цень.

Разам з намі сядзіць за сталом...

Мікалай КАЧУК.

P. S. Сёння з удзелам спецыялістаў-гісторыкаў раскопкі з мэтай устанаўлення межаў захавання працягваюцца. Кайдасава гара неахвотна вяртае свае тайны.

КАР'ЕРА

«Валасатая рука — гэта неабавязкова. Лепш, калі ёсць пачуццё незадаволенасці»

O tempora! O mores!

«О часы! О норавы!» — зноў усклікнуў бы Цыцэрон, калі б ён апынуўся ў нашай эпосе.

Пасля дзесяцігоддзяў больш-менш спакойнага, размеранага жыцця постсавецкі народ быццам стартаваў у нябачаным забегу. Гэта кругласутачны, круглагадовы марафон, на фінішы якога пераможцу чакаюць слава, улада, грошы (нязвыклыя для нас арыенціры, праўда?). Можна бегчы па розных дарожках, назвы якіх — «Бізнес», «Палітыка», «Спорт», «Мастацтва», але пра ўсіх, хто змог адолець гэты шлях, скажуць: «Ён зрабіў нядрэнную кар'еру».

У любой барацьбе ёсць прайграўшыя і пераможцы. Першыя часта зайздросцяць другім, вінавацяць у чужой дапамозе і дарэмна спрабуюць «раскусіць» формулу іх поспеху. Другія стануць гасцямі нашай новай рубрыкі і, мы спадзяёмся, падзеляцца з чытачамі некаторымі рэцэптамі сваёй удалай кар'еры.

Наш першы госць прайшоў унікальны шлях ад судовага справавода да адной з самых прыметных асоб у дзяржаве. Сёння мы гутарым са старшынёй Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь Валерыем ЦІХІНЯЙ.

— Валерый Гур'евіч, знаёмячыся з вашай біяграфіяй, можна падумаць, што вы з маленства вырашылі стаць юрыстам.

— Сапраўды. Вялікіх сумненняў пры выбары прафесіі ў мяне не было. Так ужо распарадзіўся лёс, што побач з домам, дзе мы жылі, знаходзіўся будынак суда Васілевіцкага раёна. Я вельмі часта наведваў працэсы, якія там праходзілі, і ўжо літаральна з юнацкіх гадоў бачыў і ведаў, як вяршыцца правасуддзе. Быў адзін выпадак — ён і сёння стаіць перад маімі вачыма — калі быў несправядліва асуджаны чалавек. Злачынства ён не ўчыняў, факты былі вельмі сумніўнымі, а доказы ўскоснымі (дарэчы, праз тры гады яму быў вынесены апраўдальны прыгавор). І вось тады я даў сабе слова стаць юрыстам.

— Як ставіліся да гэтага ранняга захаплення вашы бацькі?

— Спакойна. Наогул, яны ў мяне залатыя людзі. Усё станоўчае, што, спадзяюся, ёсць у маім характары, я ўзяў ад іх. Мама была хатняй гаспадыняй і таму ўдзяляла сваім тром сынам вельмі многа ўвагі. І не песціла, а менавіта выхоўвала. Я з братамі вельмі ўдзячны бацькам за тыя чалавечыя якасці, якія мы атрымалі.

— Я ведаю, вашы бацькі і цяпер жывыя. Відаць, падтрымліваюць вас?

— Так, дзякуй Богу, яны жывыя-здаровыя, хаця маюць сталы ўзрост. Бацьку ідзе 87-ы год, маці на чатыры гады маладзей. Яны часта пытаюцца ў мяне: «Ну чаму ты першым кладзеш галаву на плаху?» Адказваю, што такім ужо вы мяне выхавалі. Вядома, перажываюць, калі палітычная сітуацыя абвастраецца. Але і падбадзёрваюць.

— Вы ў юнацтве думалі, што зможаце дасягнуць такіх вышынь?

— Не думаў і не мог думаць. Таму вельмі ганаруся, што працую ў Канстытуцыйным судзе. Для юрыста заняць такую пасаду — вялікі гонар і вялікая адказнасць. Наогул, слова «кар'ера» ў нас успрымаецца чамусьці з негатыўным адценнем. Я лічу, гэта памылковая думка. Паняцце можа ўжывацца ў двух сэнсах: па-першае, як «прасоўванне па службе», па-другое, як «якое-небудзь поле дзейнасці». Гэта нармальна. Баяцца трэба другой з'явы — кар'ерызму. Кар'ерызм — імкненне прасунуцца па службе абходным шляхам, не лічачыся з інтарэсамі грамадства. Вось чаго я не прымаю ў людзях.

— У вашай кар'еры што для вас значыць больш: улада, грошы ці слава?

— Ведаеце, ніколі не займаўся такім аналізам. Заўсёды зыходзіў і зыходжу з таго, што ў жыцці ёсць тры рэчы, пачаўшы якія, нельга сказаць, чым яны закончацца: гэта каханне, палітыка і кар'ера. Як і слава, кар'ера — дама вельмі капрызная. Яна зменлівая. Заўсёды трэба быць гатовым да таго, што гэтая дама можа табе здрадзіць. І калі ў адзін цудоўны дзень вырашаць, што на гэтай пасадзе Ціхіня не патрэбен нашаму народу, я знайду іншае належнае прымяненне сваім сілам. Таму, мяркую, не трэба разглядаць кар'еру як нешта нязменнае. Сёння яна ёсць, а заўтра можа і не быць, трэба ўспрымаць гэта спакойна.

— Як бы вы вызначылі сваё жыццё: гэта паядынак у боксе, партыя ў шахматы, гульня ў рулетку ці неяк інакш?

— Партыя ў шахматы.

— А ў вас ёсць свой дэвіз?

— Маім дэвізам і кіраўніцтвам да дзеяння сталі словы маці, якая заўсёды мне казала: «Сынок, незалежна ад той пасады, якую ты будзеш займаць, ты павінен заставацца чалавекам, павінен паважліва ставіцца да людзей, памятаць, што яны, па сутнасці, утрымліваюць цябе». Калі гаварыць фігуральна, гэта так і ёсць, бо я не вырабляю матэрыяльных каштоўнасцей. Я гэта заўсёды памятаю. Мае сябры гавораць, што пасады, якія я займаю, не ўплываюць на адносіны з людзьмі. Наконт гэтага люблю гаварыць так: у наш інфляцыйны час усё, акрамя адной каштоўнасці, паддаецца інфляцыі. Каштоўнасць гэта — сапраўдная дружба.

— Але чалавеку ўласціва мець не толькі сяброў, але і ворагаў...

— Мяркую, яны ў мяне таксама ёсць. Не буду называць, хто дакладна. Адно скажу, што гэта не на глебе якіх-небудзь асабістых узаемаадносінаў.

— У адным са сваіх інтэрв'ю вы казалі, што нярэдка аказваліся ў экстрэмальных сітуацыях.

— «Дзяцінства, абпаленае вайной», — так прынята гаварыць пра маё пакаленне. У 41-м мне не было яшчэ і года. Бацька пайшоў на фронт. Вялізны цяжар і адказнасць за дзяцей леглі на плечы маёй маці. Мы жылі ў партызанскім краі і часта былі вымушаны выходзіць разам з усімі з аблавы. Аднойчы фашысты апярэдзілі нас і, зачыніўшы ўсіх жыхароў вёскі ў калгасным гумне, абкружылі яго агнямётамі. Яны прад'явілі ультыматум: калі ў наваколлі пачуецца хоць адзін стрэл і будзе параненых хаця б адзін з немцаў, спаляць усіх жывымі. Паколькі партызаны вельмі актыўна дзейнічалі ў тых мясцінах, лічу цудам, што менавіта ў гэты дзень нічога не адбылося. Пратрымаўшы ў гумне дзень, увечары нас адпусцілі...

— Скажыце, а ў дзяцінстве вы часта біліся?

— Даводзілася. Памятаю, калі я з братамі прыходзіў дадому з сінякамі, у парваных штанах і кашулі, маці казала: «Вой як дрэнна, што ў мяне адны хлопчыкі ў сям'і!» Цяпер, праўда, яна памяняла сваю думку. Не, вы не падумайце, што я быў вельмі задзірысты, але прайшоў і праз гэта.

— У такім разе, як вы ставіцеся да рызыкі?

— Я рызыкую. Але не з закрытымі вачамі. Перш за ўсё стараюся ўсвядоміць тыя вынікі, якія могуць наступіць. Калі яны неспрыяльныя для мяне асабіста, але пры гэтым робіцца добрая справа, то я іду на такую рызыку.

— Інтуіцыя ў вашай кар'еры часта дапамагала?

— Інтуіцыя больш дапамагае цяпер, з гадамі. Ці, можа, гэта проста вопыт?..

— Дарэчы, пра вопыт. Першапачаткова на ролю старшыні Канстытуцыйнага суда Прэзідэнт прапаноўваў кандыдатуру Дзмітрыя Булахава. Паспытаўшы гэтага хлеба, як вы лічыце, ці выцягнуў бы малады Булахаў такую глыбу?

— Дзмітрый Пятровіч — талковы, падрыхтаваны, на самай справе таленавіты юрыст. Але, відаць, пры вылучэнні на гэтую пасаду трэба ўлічваць і жыццёвы вопыт. Не выпадкова ў еўрапейскіх канстытуцыйных судах гэтыя пасады займаюць людзі перадпенсіённага ці пенсіённага ўзросту. У іх няма такіх абмежаванняў, як устаноўлена нашай Канстытуцыяй — 60 гадоў. У Расіі цяперашняму старшыні КС Уладзіміру Туманаву 68 гадоў. Вяртаючыся да Булахава, спашлюся на Бернарда Шоу, які сказаў, што маладосць — гэта адзіны недахоп, які праходзіць з гадамі. Думаю, за Булахавым будучыня.

— Другі таленавіты пісьменнік, Максім Горкі, назваў мэтай жыцця дасканаласць, а дзяцей — яе сэнсам. Як гэтыя паняцці фармулююцца «паводле Ціхіні»?

— На мой погляд, мэта жыцця — гэта само жыццё. Пачуццё тваёй неабходнасці, тваёй патрэбнасці людзям — вельмі дарагое і важнае пачуццё. А працаваць добра, сумленна — сэнс жыцця. Гэта заўсёды цяжка, я ўпэўніўся на ўласным вопыце.

— Год за годам, прыступка за прыступкай вы ішлі ўверх па службовай лесвіцы. Можа, які-небудзь перыяд меў асаблівае значэнне ці запомніўся вам больш за астатнія?

— Я хацеў бы выдзеліць той адрэзак сваёй працоўнай біяграфіі, калі на працягу дзевяці з паловай гадоў працаваў у органах пракуратуры. Тады я быў памочнікам пракурора горада Мінска па нагляду за разглядам грамадзянскіх спраў. Гэта вельмі складаны ўчастак, і такая школа дала мне вельмі многа. Грамадзянскія справы разглядаць больш складана, чым крымінальныя, дзе следчы назапашвае, замацоўвае, афармляе інфармацыю і доказы, а ты ўжо ў судзе падтрымліваеш абвінавачанне. У грамадзянскіх справах у вялікім моры нарматыўных актаў трэба выбіраць той часам адзіны, які трэба прымяніць у гэтым канкрэтным выпадку.

Пасля, калі працаваў пракурорам Ленінскага раёна Мінска, абараніў кандыдацкую дысертацыю, прычым узяў тэму на стыку крыміналістыкі і грамадзянскага права. Па тым часе спрабаваў сумясціць несумяшчальнае. Гэта была першая такая дысертацыя ў СССР.

А вось самы светлы час у маім працоўным жыцці, самыя цёплыя ўспаміны засталіся ад працы ў БДУ, ад адносінаў са студэнтамі.

— Вы і сёння займаецеся выкладчыцкай дзейнасцю?

— Выкладаю ў Акадэміі кіравання на юрыдычным аддзяленні. У мінулым годзе выйшаў падручнік пад маёй рэдакцыяй. Называецца «Міжнароднае прыватнае права», прызначаны для выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў ВНУ, а таксама прадпрымальнікаў, якія займаюцца знешнеэканамічнай дзейнасцю.

— Валерый Гур'евіч, вы ўпэўнены ў сабе чалавек?

— Асабіста для мяне існуе размежаванне паміж упэўненасцю і самаўпэўненасцю. Так, я ўпэўнены ў сабе, але гэту нябачную мяжу стараюся не пераступаць, каб адно не перарасло ў другое.

— Некалькімі словамі апішыце свой характар.

— Мне цяжка адказаць на гэтае пытанне. Ёсць добрая японская прыказка: «Пра сябе пытайся ў іншых». Напрыклад, мая жонка гаворыць, што я халерык. Ацэньваць сябе цяжка. Лепш давайце скажу, якія якасці ў людзях мне падабаюцца, а якія не. Я не прымаю здрады, прыстасавальніцтва і беспрынцыповасці. Мне давялося прайсці праз гэта і ўбачыць гэтыя якасці ў дзеянні.

Са станоўчых цаню ў людзях высакароднасць, адукаванасць, высокі прафесіяналізм, працавітасць і пачуццё незадаволенасці. Яно, я мяркую, павінна ўвесь час прысутнічаць у кожным, хто імкнецца да самаўдасканалення. Прынамсі, гэта пачуццё я стараюся зберагаць у сабе заўсёды.

— А чым сёння не задаволены суддзя Ціхіня?

— Калі гаварыць глабальна, не задаволены станам канстытуцыйнай законнасці ў рэспубліцы. Мы ніколькі не перабольшвалі, калі ў 1995 годзе далі ёй нездавальняючую ацэнку. Да сённяшняга дня ў нас застаецца нізкай прававая культура на ўсіх узроўнях. Я не выдзяляю. Працвітаюць прававы нігілізм, непавага да законаў. Гэта не дае падставы для аптымізму.

— У гэтым сэнсе існуюць і праблемы ва ўзаемаадносінах розных галін улады?

— Задача Канстытуцыйнага суда — не правакаваць канфлікт паміж галінамі ўлады, а даваць кампетэнтнае заключэнне аб парушэнні ці непарушэнні Канстытуцыі. Мы заўсёды сумленна рабілі гэта і, мяркую, будзем рабіць далей.

— Раскажыце пра вашы адносіны да прапановы некаторых палітыкаў ліквідаваць Канстытуцыйны суд.

— Той, хто прапаноўвае сёння ліквідаваць Канстытуцыйны суд ці яго мадэрнізаваць, імкнецца не да пабудовы прававой дзяржавы ў нашай рэспубліцы, а да сваіх кан'юнктурных мэтаў. Ёсць Канстытуцыйны суд — ёсць апора прававой дзяржавы. Калі вы хочаце парушыць гэтую апору, то, як сказаў у свой час Гётэ, «доказы можна адшукаць для ўсяго на свеце». Наша маладая незалежная дзяржава, як дзіця, робіць свае першыя крокі. А мы тут жа спрабуем выкапаць на яе шляху вялізную яму...

Нехта сабраўся памяняць Канстытуцыю. У некаторых газетах з'яўляюцца заказныя артыкулы супраць Канстытуцыі. Ды не смяшыце Еўропу! З намі ж ніхто не захоча мець справу, калі мы станем мяняць свой Асноўны закон як пальчаткі.

— Па натуры вы — змагар. Неяк расійская рок-зорка Барыс Грабеншчыкоў сказаў, што «пакуль мы змагаемся, у нас не хапае часу жыць»...

— Пасля такой працы хочацца адзіноты. І я знаходжу яе на сваёй дачы, якую мы з жонкай пабудавалі ў 1991 годзе. Драўляны, двухпавярховы, невялікага памеру, але вельмі ўтульны дом. Там я знаходжу душэўны спакой. Жонка любіць капацца ў зямлі...

— А вы ў гэты час лежыце на канапе?

— Не. Не магу сабе гэтага дазволіць. Даводзіцца займацца фізічнай працай, і гэта таксама свайго роду разрадка.

— Як будуецца ваш працоўны дзень?

— Устаю ў шэсць гадзін раніцы, каб зрабіць нешта за пісьмовым сталом да таго, як з'яўлюся ў будынку КС. Тут праца працягваецца да 6-7 гадзін вечара. Пасля гэтага ў мяне невялікі адпачынак і час на прагляд навін — расійскіх і беларускіх. Каля 22 гадзін стараюся папрацаваць за сталом гадзіну-другую. Мой цар — гэта мой рабочы стол. А нядаўна мы разам з суддзёй КС прафесарам Пастуховым пачалі падрыхтоўку энцыклапедычнага юрыдычнага слоўніка па канстытуцыйнаму праву. Да канца года маем намер выдаць гэты слоўнік. Вось на што сёння ідзе час.

— Працяглая праца часта прыводзіць да нервовых перагрузак. Каб неяк ад іх пазбавіцца, некаторыя шукаюць выйсце ў спіртным і нікаціне.

— Адзінае, чым магу «пахваліцца», дык тым, што курыў недзе з паўгода, калі працаваў пракурорам. Дзякуй Богу, не ўцягнуўся і кінуў. Для мяне ў гэтым сэнсе жывы прыклад — бацька. Ён усё жыццё курыў, умудраўся выкурваць па два пачкі цыгарэт у дзень. Але калі заўважыў, што мой брат Анатоль стаў займацца гэтым, то бацька, каб паказаць, што гэта шкодная звычка, кінуў курыць. І толькі потым я зразумеў, якую волю трэба мець прафесіяналу-курцу, каб так зрабіць!

— Ці часта вам у вашай кар'еры даводзілася пазбаўляцца ад нечага ў сваім характары, мяняць сябе?

— З гадамі я паспрабаваў выжыць з сябе радыкалізм мыслення. Здаецца, атрымалася. Я ўпэўнены, што мы самі павінны распаладжаць сваім лёсам. Чалавек заўсёды ў адказе перад самім сабой. Кожны павінен дапамагаць сабе сам. Гэта датычыцца і шкодных звычак, і жыцця наогул. Бо ў маладосці ў мяне не было «валасатай рукі», не было родных ні ў Маскве, ні ў Мінску, і ніхто не падштурхоўваў па службовай лесвіцы. Але было іншае — усведамленне сумлення як найвышэйшай каштоўнасці, а таксама таго, што я сам сабе гаспадар.

Цімур КУДЗЕЯР.

Валерый ЦІХІНЯ

Нарадзіўся 1 кастрычніка 1940 г. у г. п. Капаткевічы (Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл.) у сям'і служачых.

Працаваў справаводам народнага суда Васілевіцкага р-на Гомельскай вобласці. У 1958 годзе, пасля заканчэння з сярэбраным медалём школы рабочай моладзі, з першай спробы паступіў на юрыдычны факультэт БДУ. Пасля яго заканчэння быў экспертам у НДІ судовых экспертыз, потым у органах пракуратуры.

З 1975 па 1989 год выкладаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Вырас да дэкана юрыдычнага факультэта, а пазней — прарэктара па вучэбнай рабоце.

Зорка В. Ціхіні як дзяржаўнага дзеяча ўспыхнула ў 1989 г., калі яго прызначылі міністрам юстыцыі БССР. У 1990 г. на з'ездзе партыі практычна аднагалосна (пры адным устрымаўшымся) быў абраны сакратаром ЦК КПБ. Таксама з 1990 года — дэпутат Вярхоўнага Савета 12-га склікання.

У 1991 годзе — загадчык кафедры Акадэміі кіравання пры Савеце Міністраў РБ, з 1993 г. — намеснік старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі.

Свае дэпутацкія паўнамоцтвы склаў у 1994 годзе, калі стаў членам Канстытуцыйнага суда РБ.

З сакавіка 1995 года — старшыня Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь.

Доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі, віцэ-прэзідэнт Беларускай акадэміі кіравання, заслужаны юрыст РБ.

Яго пяру належыць каля 200 навуковых прац па прававой праблематыцы. Падрыхтаваў 7 кандыдатаў юрыдычных навук.

Жанаты, мае дваіх дзяцей. Жонка — вядомы ў рэспубліцы адвакат. Дачка і сын закончылі юрыдычны факультэт БДУ.

БАЛЬШАВІЗМ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ

Упершыню я публічна выступаю з крытыкай Беларускага народнага фронту. Пачынаючы з 1990 года мне даволі часта даводзілася сустракацца з лідэрамі БНФ, удзельнічаць з імі ў розных мерапрыемствах, абмяркоўваць тыя ці іншыя падзеі. Адным словам, я добра ведаю, што і як варылася на гэтай кухні. Задумка расказаць праўду была даўно, але адольвалі сумненні, ці зразумеюць мяне.

І вось 1 мая 1996 года, вярнуўшыся з плошчы Незалежнасці, дзе адбыўся шматтысячны мітынг, я ўзяўся за пяро. І шэсце па праспекце Скарыны, і мітынг на плошчы Незалежнасці — з'ява для Беларусі унікальная. Унікальнасць яе ў тым, што ўпершыню падзея такога маштабу адбылася без удзелу Беларускага народнага фронту. Больш таго, БНФ не толькі адмовіўся ісці на плошчу, але прыкладваў вялікія намаганні, каб сарваць гэтую палітычную акцыю. Запалохаць і падмануць народ не ўдалося: тысячы людзей арганізавана, без канфліктаў з міліцыяй, у межах адведзенай паласы праспекта, не замінаючы транспарту, дайшлі да плошчы Незалежнасці.

З гэтай падзеі напрошваюцца дзве высновы. Па-першае, уладныя структуры зразумелі, што сілавымі метадамі спыніць выступленне народа немагчыма. Дубінкі даюць адваротны эфект. Масавасць пратэстуючых узрастае, як у ланцуговай рэакцыі. Па-другое, манаполія БНФ на дэмакратыю і дэмакратычны рух скончылася. У тым ліку, бела-чырвона-белы сцяг і беларускую мову. Выраслі і ўзмацнелі іншыя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі, здольныя павесці за сабой народ.

Я не адмаўляю гістарычнай ролі Беларускага народнага фронту ў барацьбе з таталітарызмам, супраць манаполіі камуністаў на ўладу, за адраджэнне Беларусі як дзяржавы і беларускага народа як нацыі. Але такія задачы запісаны ў праграмах ўсіх дэмакратычных партый. Узнікае пытанне: ці ёсць прынцыповае адрозненне БНФ і іншых дэмакратычных партый? Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба звярнуцца да гісторыі.

Яшчэ ў дзевяностым годзе была распрацавана філасофія цэнтрызму. Сутнасць яе — палітыка здаровага сэнсу, прыярытэт правоў чалавека, адмаўленне крайніх праяў нацыяналізму і шавінізму, кансалідацыя грамадства. У той час на тэрыторыі СССР адбывалася жорсткае процістаянне паміж камуністамі і народнымі франтамі. У асобных рэгіёнах пралілася кроў. Каб пазбегнуць грамадзянскай вайны на шматпакутнай зямлі Беларусі, мы і будавалі на грунце цэнтрызму Сялянскую партыю як трэцюю сілу. Але ў той час грамадства яшчэ не даспела да неабходнасці такой ідэі. Другую спробу зрабіў нябожчык Міхась Ткачоў, вядомы гісторык і краязнаўца, лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады. На пачатку 1992 года ён прапанаваў утварыць трэцюю сілу шляхам аб'яднання палітычных партый, грамадскіх арганізацый і прыватных асоб, якія выступаюць за цывілізаваны пераход ад таталітарнай сістэмы да прававой дэмакратычнай дзяржавы. Вясной 92 года была ўтворана Партыя народнай згоды. Ядром яе стала група народных дэпутатаў, якія яшчэ да путчу ўтварылі ў Вярхоўным Савеце фракцыю «Камуністы Беларусі за дэмакратыю». Сама назва партыі, асноўныя праграмныя прынцыпы яе сведчылі пра жаданне стаць асновай трэцяй сілы на Беларусі.

Нарэшце, у 1995 годзе былі ўтвораны два палітычныя саюзы: левацэнтрысцкі «Сацыял-дэмакратычны саюз» і правацэнтрысцкі — «Грамадзянскае дзеянне». Абодва палітычныя ўтварэнні маюць у Вярхоўным Савеце невялікія фракцыі — па васемнаццаць дэпутатаў. Па праблемах дзяржаўнасці, законнасці і эканамічных пераўтварэннях яны аднадушныя. Такім чынам, ідэя трэцяй сілы на Беларусі стала рэальнасцю. Шляхам спроб і памылак яна прабіла сабе дарогу ў жыццё.

Беларускі народны фронт з самага пачатку выступаў супраць утварэння трэцяй сілы. Яго пазіцыя адназначная: ёсць толькі БНФ і камуністы. Усе, хто яшчэ не вызначыўся, павінны зрабіць свой выбар і стаць ці на бок фронту, ці на бок камуністаў. У гэтай пазіцыі праявіўся бальшавізм Народнага фронту: хто не з намі— той супраць нас. Як бачыце, такая палітыка вядзе да расколу грамадства на дзве палярныя сілы. Іх процістаянне можа прывесці да адкрытай барацьбы. Палярызацыя грамадства востра ставіць праблему выжывання нацыі. І тут не да філасофскіх разважанняў. Трэба званіць ва ўсе званы, будзіць народ і ратаваць Бацькаўшчыну.

Паўстаюць два вечныя пытанні: хто вінаваты і што рабіць?

Безумоўна, віна дзяржаўных структур, што ўсе гэтыя гады яны варожа ставіліся да дэмакратычных палітычных партый, прыніжалі іх ролю, абмяжоўвалі доступ да сродкаў масавай інфармацыі. Паміж палітычнымі партыямі і ўладамі па віне апошніх адсутнічае дыялог. Маюць месца і факты дэзінфармацыі і фальсіфікацыі дзейнасці палітычных партый з боку сродкаў масавай інфармацыі. Навіны з Масквы пра першамайскі мітынг у Мінску перадалі так: «Адбыўся альтэрнатыўны мітынг, арганізаваны апазіцыйным Беларускім народным фронтам». Хлусня. Усё гэта разам узятае стварае ўражанне, што камуністам супрацьстаіць толькі БНФ. Дзейнічае і псіхалагічны фактар. Значная частка людзей хочуць перачакаць цяжкія часы, адсядзецца ў баку ад грамадскага жыцця. Не выйдзе, шаноўныя. Апалітычнасць таксама палітыка. Калі вы не займаецеся палітыкай, то палітыка будзе займацца вамі.

Адсюль выцякае адказ на пытанне: што рабіць. Не дапусціць раскола грамадства, умацоўваць і падтрымліваць трэцюю сілу на Беларусі. Іншага шляху няма.

Асабліва звяртаю ўвагу на палітычны саюз «Грамадзянскае дзеянне». У склад яго ўваходзіць Беларуская сялянская партыя. Яна з 1991 года дамагаецца правядзення зямельнай рэформы. Аб'яднаная грамадзянская партыя прытрымліваецца лібералыпай ідэі, прапануе радыкальную рэформу. Сярод яе кіраўнікоў вядомыя палітыкі і таленавітыя эканамісты. Праблемы экалогіі адстойвае Беларуская партыя «Зялёны свет». Да палітычнага саюза далучылася і Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя. Яна ставіць сваёй мэтай духоўнае адраджэнне нацыі.

Апошнія падзеі паказалі неабходнасць дыялога, круглага стала паміж уладай і грамадствам.

У заключэнне скажу, што праблема суадносін палітычных партый і БНФ патрабуе дакладнага аналізу і глыбокага асэнсавання. Я толькі акрэсліў контуры гэтай праблемы і запрашаю да дыскусіі як у сродках масавай інфармацыі, так і непасрэдна. Кантактныя тэлефоны: 34-38-35, 77-04-33.

Яўген ЛУГІН, старшыня Беларускай сялянскай партыі.

АФІЦЫЙНА

ЗАЦВЕРДЖАНА
Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
ад 6 мая 1996 г. № 160

ПАЛАЖЭННЕ
аб Камітэце па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь

1. Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь (далей — Камітэт) з'яўляецца дзяржаўным органам, на які ўскладаецца прысуджэнне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь (далей — Дзяржаўныя прэміі) з наступным прадстаўленнем на зацвярджэнне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

Камітэт у сваёй дзейнасці кіруецца дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і гэтым Палажэннем.

Камітэт складаецца з двух падкамітэтаў, першы з якіх прымае рашэнні аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій у галіне навукі і тэхнікі, другі — у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

2. Састаў Камітэта фарміруецца з выдатных вучоных, буйных спецыялістаў-практыкаў, майстроў літаратуры, мастацтва, архітэктуры па рэкамендацыях Акадэміі навук Беларусі, Акадэміі аграрных навук, міністэрстваў, іншых цэнтральных органаў кіравання, аб'яднанняў, прадпрыемстваў, навукова-даследчых устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, грамадскіх аб'яднанняў рэспублікі і зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь тэрмінам на 4 гады. Члены Камітэта могуць удзельнічаць у яго рабоце не больш чым 8 гадоў.

Камітэт узначальваюць два сустаршыні (старшыні падкамітэтаў). Работай кожнага падкамітэта кіруе прэзідыум у саставе старшыні падкамітэта, яго намесніка, старшынь секцый і вучонага (адказнага) сакратара. Персанальны састаў прэзідыума падкамітэта зацвярджаецца старшынёй падкамітэта.

3. Камітэт у адпаведнасці з ускладзенымі на яго задачамі:

прымае да папярэдняга разгляду работы, вылучаныя на атрыманне Дзяржаўных прэмій, ажыццяўляе кантроль за захаваннем устаноўленага парадку іх вылучэння, адбірае найбольш дастойныя работы для ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій, публікуе ў прэсе спіс гэтых работ з указаннем аўтараў, арганізуе іх грамадскае абмеркаванне;

праводзіць усебаковае вывучэнне дапушчаных да конкурсу работ, накіроўвае іх для экспертнага разгляду ў міністэрствы, іншыя цэнтральныя органы кіравання, аб'яднанні, установы, арганізацыі, навукова-даследчыя інстытуты і вышэйшыя навучальныя ўстановы, аналізуе атрыманыя ад экспертаў заўвагі і прапановы па ўказаных работах.

Абмеркаванне работ і творчага ўкладу іх аўтараў праводзіцца ў форме дыскусій у абстаноўцы высокай патрабавальнасці і прынцыповасці, пры гэтым абавязковаму аналізу падвяргаюцца дакладнасць і абгрунтаванасць усіх вывадаў і вынікаў, адпаведнасць работ устаноўленым патрабаванням;

садзейнічае распаўсюджванню творчага вопыту і дасягненняў лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій.

4. Рашэнне аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій прымае адпаведны падкамітэт і накіроўвае яго на зацвярджэнне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

5. Падкамітэт мае права:

ствараць секцыі па асобных галінах навукі, тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры для папярэдняга разгляду работ, вылучаных на атрыманне Дзяржаўных прэмій. Парадак работы такіх секцый вызначаецца прэзідыумам падкамітэта;

прыцягваць вучоных і спецыялістаў да рэцэнзавання і экспертнага разгляду работ, вылучаных на атрыманне Дзяржаўных прэмій.

Парадак рэцэнзавання і экспертнага разгляду работ вызначаецца прэзідыумам падкамітэта;

камандзіраваць членаў падкамітэта і экспертаў для азнаямлення на месцы з вынікамі работ, вылучаных на атрыманне Дзяржаўных прэмій, і творчым укладам атрымальнікаў;

кантраляваць выкананне ўстаноўленага парадку вылучэння і экспертнага разгляду работ, прадстаўленых на атрыманне Дзяржаўных прэмій.

6. Асноўнай формай работы падкамітэта з'яўляецца пасяджэнне.

Пасяджэнні падкамітэта праводзяцца па меры неабходнасці і лічацца правамоцнымі пры наяўнасці на іх не менш чым 2/3 саставу падкамітэта.

Рашэнні падкамітэта аб допуску работ да конкурсу на атрыманне Дзяржаўных прэмій і аб іх прысуджэнні прымаюцца на пасяджэнні падкамітэта тайным галасаваннем.

Для допуску да конкурсу работа павінна набраць большасць (больш за палову) галасоў, для прысуджэння Дзяржаўнай прэміі — не менш за 3/4 галасоў прысутных на пасяджэнні членаў падкамітэта. Калі колькасць работ, якія набралі неабходную для прэміравання колькасць галасоў, перавышае ўстаноўленую колькасць Дзяржаўных прэмій, то на зацвярджэнне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прадстаўляюцца работы, што набралі большую колькасць галасоў.

Калі на атрыманне Дзяржаўнай прэміі вылучана работа члена падкамітэта, яе аўтар не мае права прымаць удзел у рабоце секцый, што разглядаюць творы, вылучаныя на атрыманне прэмій, у абмеркаванні і галасаванні.

7. Пры падкамітэце ствараецца пастаянна дзеючы рабочы орган — сакратарыят, узначалены вучоным (адказным) сакратаром. У састаў сакратарыята ўваходзіць таксама тэхнічны сакратар.

Сакратарыят падкамітэта ажыццяўляе наступныя функцыі:

прымае работы, прадстаўляемыя на атрыманне Дзяржаўных прэмій, і правярае правільнасць афармлення дакументаў, якія спадарожнічаюць работам;

арганізуе грамадскае абмеркаванне работ, дапушчаных да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій, у друку і ў калектывах прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый з шырокім прыцягненнем навукова-тэхнічнай, творчай грамадскасці, спецыялістаў народнай гаспадаркі;

падрыхтоўвае пасяджэнні падкамітэта і яго секцый;

рэалізуе прынятыя падкамітэтам рашэнні;

афармляе дыпломы і ганаровыя знакі лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій, арганізуе іх ушанаванне, а таксама ўручэнне грашовай часткі прэміі;

вывучае творчы вопыт і дасягненні лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій, папулярызуе іх праз сродкі масавай інфармацыі;

вырашае ўсе аператыўныя пытанні, звязаныя з дзейнасцю падкамітэта.

Персанальны састаў сакратарыята зацвярджаецца старшынёй падкамітэта.

8. Пакрыццё расходаў, звязаных з рэцэнзаваннем і экспертным разглядам работ, вылучаных на атрыманне Дзяржаўных прэмій, камандзіраваннем членаў Камітэта і экспертаў для азнаямлення на месцы з вынікамі гэтых работ і творчым укладам атрымальнікаў, а таксама расходаў, звязаных з вырабам дыпломаў і ганаровых знакаў лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій, арганізацыяй іх уручэння, ажыццяўляецца за кошт сродкаў, выдзяляемых на ўтрыманне Прэзідыума Акадэміі навук Беларусі.

Для забеспячэння работы сакратарыята кожнага падкамітэта ў штаце Прэзідыума Акадэміі навук Беларусі прадугледжваюцца дзве штатныя адзінкі.

9. Камітэт мае пячатку з відарысам Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і са сваім найменнем, адпаведныя бланкі для перапіскі.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
ад 6 мая 1996 г. № 160

ПАЛАЖЭННЕ
аб Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі

1. Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі (далей — Дзяржаўная прэмія) прысуджаецца за:

выдатныя навуковыя дасягненні, якія адпавядаюць сусветнаму ўзроўню і садзейнічаюць далейшаму развіццю гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навук;

распрацоўку і ўкараненне новых відаў тэхнікі, матэрыялаў і тэхналогій, новых спосабаў і метадаў лячэння і прафілактыкі захворванняў, якія па сваіх паказчыках адпавядаюць лепшым сусветным аналагам, забяспечваюць вырашэнне праблем развіцця і павышэння эфектыўнасці эканомікі, рэсурсазбярожэння, аховы навакольнага асяроддзя і здароўя насельніцтва;

падручнікі для вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, каледжаў, сярэдніх агульнаадукацыйных школ, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням, вызначаюцца высокімі навукова-метадычнымі якасцямі і атрымалі шырокае грамадскае прызнанне.

2. Навуковыя працы і падручнікі, якія вылучаюцца на атрыманне Дзяржаўнай прэміі, павінны быць апублікаваны, а новыя віды тэхнікі, матэрыялаў і тэхналогій, новыя спосабы і метады лячэння і прафілактыкі захворванняў — асвоены і ўкаранёны не менш чым за год да заканчэння тэрміну прыёму работ.

3. Адзін раз у два гады (кожны цотны год) прысуджаюцца дванаццаць Дзяржаўных прэмій, у тым ліку:

у галіне гуманітарных і сацыяльных навук — дзве прэміі (адна — у галіне гуманітарных навук, адна — у галіне сацыяльных навук);

у галіне прыродазнаўчых навук — пя

РАСІЙСКІЯ МЫТНІКІ НЕ ЗУСІМ ЗАДАВОЛЕНЫ БЕЛАРУСКІМІ КАЛЕГАМІ

Мытны саюз, які дзейчае ўжо больш года, адбыўся і прынёс павелічэнне мытных плацяжоў у бюджэт Беларусі ў 4-5 разоў. У яго бліжэйшай перспектыве — падрыхтоўка заканадаўчых актаў для поўнай уніфікацыі мытнага права ў краінах гэтага саюза, падрыхтоўка пагаднення аб фінансаванні і ўтрыманні аб'ектаў пагранічнай і мытнай інфраструктуры, падрыхтоўка прапаноў аб увядзенні адзінай сістэмы кіравання мытнымі службамі,— аб гэтым заявіў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта РФ Валерый Драганаў на прэс-канферэнцыі 14 мая. Памежная інфраструктура ў нашай краіне павінна ўзводзіцца на сродкі ўсіх краін Мытнага саюза, транспарт якіх едзе транзітам праз Беларусь, зазначыў В.Драганаў. Расійскі ж транзіт праз Беларусь, паводле яго слоў, складае звыш 70 працэнтаў.

Прадстаўнік расійскай мытнай службы ў Беларусі, створанай роўна год назад у адпаведнасці з пагадненнем аб мытным саюзе, Валерый Драганаў, гаворачы аб плённасці мытнага саюза для Расіі і Беларусі, усё ж зазначыў, што ў расійскіх мытнікаў ёсць пэўныя рознагалоссі з беларускімі. Датычацца яны перш за ўсё поглядаў на стварэнне на заходніх межах Беларусі сучасных пагранічных тэрміналаў. Расійскі бок зыходзіць з таго, што гэтыя тэрміналы павінны адпавядаць не толькі сучасным патрабаванням, але і ўлічваць перспектыву на бліжэйшыя 10—15 гадоў. Ствараемыя тэрміналы на думку В.Драганава, павінны ўяўляць сабой сукупнасць умоў для жорсткага і хуткага мытнага кантролю і разгорнутага сервісу: на мытні замежны транспартны сродак павінны сустракаць мытны брокер, страхавы агент, банкаўскі служачы, якія павінны дапамагчы вадзіцелю ўладзіць усе справы, заказаць нумар, сауну, даць напракат машыну, каб наведаць Брэст ці Гродна і г. д. — такую прыгожую карцінку намаляваў журналістам В.Драганаў і падкрэсліў, што яна ўжо стала рэальнасцю на некаторых расійскіх прапускных пунктах і тэрміналах, якія былі ўзведзены за 10 месяцаў. Каб гэтага дабіцца, на думку В.Драганава, трэба дапусціць прыватны капітал да фінансавання будаўніцтва і эксплуатацыі аб'ектаў інфраструктуры на гэтых пагранічных тэрміналах.

Беларускі мытны камітэт, аднак, паводле слоў В.Драганава, не згаджаецца на допуск прыватнікаў у гэтую справу, а вядзе гаворку толькі пра павелічэнне колькасці палос для пропуску аўтамашын. Падыход, які прапаведуе Драганаў, на яго думку, павінен быць прыцягальным для замежных кампаньёнаў нашых фірмаў у гандлі, павелічэння інвестыцый, выплат падаткаў ад прыватных фірмаў і працаўладкавання на ствараемых аб'ектах пагранічнай інфраструктуры. Падыход беларускіх мытнікаў Драганаў назваў схаластычным... Тым больш, што ў дзяржавы няма сродкаў на фінансаванне будаўніцтва тэрміналаў і вырашэнне праблемы празмерна доўгіх чэргаў на граніцах, якія ўжо прыніжаюць годнасць і людзей, і краіны.

В.Драганаў паведаміў, што расійская мытная служба выканала свае абяцанні і паставіла ў Беларусь неабходнага сучаснага абсталявання на суму, роўную 20 працэнтам гадавога бюджэту беларускай мытні, аднак дасюль Мытны камітэт Беларусі не можа гэта апрыходаваць, не ведае, як аформіць акты прыёму — перадачы, бо няма адпаведнай нарматыўнай базы...

Самымі нечаканымі для расійскіх мытнікаў былі надзвычай павольныя тэмпы структурнай перабудовы працы беларускай мытні. «Калі не будзе больш энергічных крокаў у гэтым накірунку, то можа стаць пад сумненне сам лёс мытнага саюза». В.Драганаў выказаўся за далейшае ўмацаванне беларускай мяжы з Украінай і краінамі Прыбалтыкі, ён заявіў, што расійскі бок настойвае на тым, каб беларускія мытныя службы сфарміравалі ваенізаваныя мытныя атрады па барацьбе з кантрабандай, расіяне гатовы падзяліцца сваім адпаведным вопытам. В.Драганаў зазначыў, што неабходна максімальна набліжаная да 100-працэнтнай уніфікацыя мытнага заканадаўства Расіі і Беларусі, бо экспарцёры заўсёды знаходзяць нейкія пралазы і сходзяць ад больш жорсткага рэжыму ў межах мытнага саюза да больш лёгкага. Пры гэтым бюджэты абедзвюх краін губляюць немалыя сродкі. А беларускі бок пакуль што не спяшаецца з падобнай уніфікацыяй, на гэтую тэму В. Драганаў меў гутарку з намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Ю.Малумавым. Беларусі трэба ствараць свой Мытны кодэкс. Ад таго, што беларускае заканадаўства не было прыведзена ў адпаведнасць з расійскім, бюджэты дзвюх краін нямала страцілі, заўважыў Драганаў.

Гаворачы аб вядомым скандале вакол нашай фірмы «Торгэкспа», якая атрымала мытныя льготы на некалькі соцень мільёнаў долараў і бяспошлінна паставіла ў Расію шмат імпартных тавараў, Валерый Драганаў заўважыў, што эпапея гэтая падыходзіць да канца. У выніку рознага роду перагавораў дасягнута дамоўленасць, што тавары гэтыя будуць перавезены назад на тэрыторыю Беларусі без права продажу ў сумежных краінах, а плацяжы, якія павінны былі паступіць у сувязі з гэтымі здзелкамі, павінны быць пераведзены ў бюджэты.

Валер КАЛІНОЎСКІ.

ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ СЯМ'І

БУДУЧЫНЯ НАЦЫІ СТВАРАЕЦЦА ТОЛЬКІ ПРАЗ СЯМ'Ю

«УСЕ ШЧАСЛІВЫЯ СЕМ'І ПАДОБНЫЯ АДНА НА АДНУ, УСЕ НЕШЧАСЛІВЫЯ — НЯШЧАСНЫЯ ПА-СВОЙМУ».
Леў ТАЛСТОЙ.

У маіх знаёмых адвечная праблема — няма грошай. Таму зноў у тэлефоннай трубцы прабачлівы голас Сяргея: «Прабач, дружа, ці не пазычыш на месяц...» Вядома, пазычаю. У падзяку за гэта мяне запрашаюць у госці. Купляю віно, падарункі дзецям, саджуся ў тралейбус, еду. Званю ў дзверы, чуецца шум малышоў, якія спрачаюцца за тое, каму адчыніць дзверы, голас бацькі. Нарэшце адчыняюць і я заходжу ў прыемны паўзмрок вялікай трохпакаёвай кватэры. Распранаюся, абуваю нязменныя тапкі для гасцей і шлёпаю на кухню. «Якія яны ўсё-такі шчаслівыя, — думаю, — свой дом, як гэта добра!». Таня корпаецца ля пліты, заканчваючы прыгатаванне няхітрай вячэры. Абменьваемся думкамі наконт пагоды-прыроды. Раздаю «кіндэры» дзятве, яны, радасныя, выбягаюць даставаць сюрпрызы. А мы застаёмся ўтраіх пагаварыць...

...пра работу

Мае знаёмыя — рабочыя Мінскага трактарнага завода. Сяргей — выпрабавальнік, Таня — камп'ютэршчыца. Хоць, між намі, пачынаюць забываць працоўныя навыкі, бо завод часта прастойвае. Затое святы ў іх заўсёды большыя, чым у іншых. Дапусцім, Новы год усе святкавалі два-тры дні, а трактаразаводцаў адправілі гуляць аж на месяц. Словам, добрая работа, калі б грошы плацілі. Але мае знаёмыя зусім не гультаі, яны згодны працаваць, сумленна працаваць і атрымліваць грошы за сваю работу. Сяргей радуецца, што стала больш трактароў сыходзіць са зборачнага канвеера — надакучыла цэлымі днямі не па сваёй волі ў карты ды ў даміно перакідвацца. Прастоі гультаёў выхоўваюць, забіваюць працоўны настрой. Стомленасць ад гультайства настае — быццам бы і не рабіў нічога, а калі прыходзіш дадому, як сноп валішся на ложак. Радуецца Сяргей гулу канвеера і шуму матораў. Ды і яму гэта, мабыць, толькі ўспамінаецца цяпер як старое добрае мінулае, калі МТЗ лічыўся адным з самых галоўных заводаў рэспублікі. Сяргей тады стаяў на нагах больш упэўнена, быў сапраўдным карміцелем. Мой знаёмы паскардзіўся на тое, што дзяржава цяпер больш падобна на багадзельню, дзе пануюць гультаі і прайдзісветы, чым на строгую і мудрую школу жыцця. Сам сябе «вінцікам» Сяргей не лічыць, таму што кожны чалавек — цэлы свет. Работай ён незадаволены, хоць цяпер заводскае жыццё крыху актывізавалася, ёсць заказы на трактары. Але прастоі ўсё роўна засталіся. Таня, праўда, працуе ўжо другі месяц рэгулярна. Прычым у тры змены па чарзе: калі першая — устае ў пяць раніцы, трэцяя — ідзе на завод у адзінаццаць вечара. Вось такія справы. Няспешна і звычайна рухаецца жыццё сям'і маіх знаёмых. Руціна будзённых спраў зацягвае, таму на выхадныя яны едуць у вёску праведаць бацькоў. Таму пагаворым...

...пра бацькоў

Таня і Сяргей — тыповыя вясковыя людзі, ім падабаецца капаца на агародзе, зграбаць сена, секчы дровы і нават палоць. У сувязі з гэтым паездкі ў вёску даволі частыя, хоць бацькі Тацяны жывуць аж за 300 кіламетраў ад Мінска. Туды трэба дабірацца паўдня. Але для маіх знаёмых гэта акалічнасць не адыгрывае абсалютна ніякай ролі. І тут яны зусім шчыра прызнаюцца: ну што значыць пратрэсціся пяць гадзін у электрычцы! Затое выбегуць радасныя бацькі на парог, кінуцца абдымаць і цалаваць дзяцей і ўнукаў. Потым сядуць за стол, пагавораць пра жыццё-быццё. Сяргей прыдумаў, што ў гэтых паездках сям'я павялічваецца ўдвая — гэта значыць дабаўляюцца бацькі. Прыемна адчуваць сябе дзіцем перад сівымі бацькамі. А для тваіх дзяцей яны ўжо бабуля і дзядуля. Час бяжыць няўмольна хутка. А сям'я застаецца самай надзейнай крэпасцю ў моры сучаснасці. Бацькі Сяргея таксама вясковыя жыхары, усё жыццё пражылі ў вёсцы. Дзеткі вось выехалі ў сталіцу, захацелі зведаць гарадскога жыцця, а старыя засталіся на зямлі. А што, нехта з вялікіх гаварыў аб горадзе як аб прыстанішчы зла і заган. Напэўна, ён усё ж меў рацыю — людзі ў вёсцы і прасцейшыя, і душою больш чыстыя. Хоць і там хапае сваіх падлюг і прайдзісветаў. Але для маіх знаёмых вёска — гэта і радзіма, і адпачынак. Адчуеш рукі мамы на сваёй галаве і ўспомніш аб сваіх...

...пра дзяцей

Дзіма і Андрэй амаль аднагодкі: старэйшаму — шэсць, малодшаму — пяць гадоў. Гэта невялікая розніца ва ўзросце амаль не адчуваецца. Яны жывуць у пастаянным руху. Шум і гоман, часам слёзы — так гадуюцца дзеці. Я памятаю іх яшчэ зусім маленькімі. Тады Сяргею і Тані прыходзілася цяжкавата, асабліва калі дзеці хварэлі. Але нічога — выстаялі. Так, растуць, растуць... Старэйшы ўжо ў другім класе вучыцца. Вялікія поспехі мае ў англійскай мове. За ўрокі заўсёды садзіцца неахвотна, асабліва цяпер, калі сонейка прыпякае. Але ўвогуле паспяховасць у яго нядрэнная. Дзякуючы невераголным намаганням Тані, якая пастаянна дапамагае і прымушае сына. Часам плачуць разам над цяжкай задачкай, разам жа і радуюцца поспехам. Малодшы Андрэй таксама без ахвоты спасцігае азы граматы. У дзіцячым садку іх аднойчы вучылі маляваць... Ісуса Хрыста. Дык у яго нічога не атрымлівалася — залез пад парту і сядзеў там гадзіны дзве. Цікавае такое дзіця: ходзіць, ходзіць ціхенька, а потым што-небудзь як утворыць.

Дзеці — гэта і радасць, і велізарныя клопаты. Хочацца многае ім купіць, але часта не хапае грошай. Прыходзіцца з болем у сэрцы адмаўляць ім. Самая балючая размова...

...пра грошы

Сяргей і Таня атрымліваюць па шэсцьсот тысяч кожны. Хоць працуюць неаднолькавую колькасць дзён у месяц. Сяргей атрымлівае за дзесяць дзён, Таня — за дваццаць. Мільён дзвесце тысяч. Калі падзяліць на чацвярых, то атрымліваецца па трыста тысяч кожнаму ў месяц, ці дзесяць тысяч у дзень. Але ўсё гэта даволі банальныя падлікі, бо калі вылічыць плату за кватэру (300 тысяч), за дзіцячы садок (каля 100 тысяч), за платныя ўрокі англійскай мовы для старэйшага сына (50 тысяч), то атрымліваецца даволі сціплая сума ў памеры 750 тысяч беларускіх «зайчыкаў». Уявіце: дзённы бюджэт сям'і маіх знаёмых складае 25 тысяч. А калі вылічыць плату за праезд у грамадскім транспарце, куплю неабходных рэчаў і многа-многа чаго іншага, то на харчаванне не застаецца зусім нічога. Дзякуй Богу, бацькі дапамагаюць чым могуць — вёска корміць. Але ж гэта таксама не жыццё! Сяргей і Таня зусім не лічаць сябе беднякамі. Таму што калі прызнаць іх такімі, трэба прызнаць беднай усю рэспубліку. У маіх знаёмых ёсць хоць кватэра і мэбля, набытыя ў застойныя часы. Маладыя людзі цяпер на гэта і не спадзяюцца.

«Сям'я — ячэйка дзяржавы».

— пісаў класік. Так, яна з'яўляецца такой. Але многія, хто цяпер уступае ў жыццё, задумваюцца, перш чым пачуць вальс Мендэльсона: а ці варта? І сапраўды, колькі цяпер каштуе сямейнае жыццё. Сяргей, напрыклад, стаў донарам і зарабляе для сям'і ўласнай крывёю. Іншыя кідаюцца на свае страх і рызыку ў «чаўночныя рэйсы». Варта, напэўна, задумацца над будучыняй нацыі, якая ствараецца толькі праз сям'ю. І ўжо калі шчаслівыя закаханыя лічаць кожную капейку, то аб якіх дзецях можа ісці размова? Зрэшты, а ці шчаслівыя гэтыя двое?

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ДЫСКУСІЯ ВАКОЛ ПАШЫРЭННЯ НАТО

Міжнародная напружанасць, якая ўзнікла ў Еўропе вакол мяркуемага пашырэння НАТО, працягвае выклікаць сутыкненні поглядаў і пазіцый як паміж краінамі Захаду і Усходу, так і паміж рэспублікамі былога СССР і нават членамі СНД.

Не выпадкова гэта праблема была, бадай, галоўнай у час работы міжнароднай канферэнцыі па еўрапейскай бяспецы ў Мінску.

Адзін з яе арганізатараў, прэзідэнт цэнтра стратэгічных ініцыятыў Анатоль Майсеня, даволі катэгарычна выказаўся супраць прыняцця ў НАТО новых членаў. Гэта, на яго думку, моцна пашкодзіла б рэжыму даверу паміж Усходам і Захадам і прывяло б да штучнай ізаляцыі Расіі, іншых новых, незалежных ад Еўропы і дэмакратычнай супольнасці дзяржаў, выклікала б там рост антызаходніх настрояў. А што датычыць Беларусі, то ў сённяшнім палітычным кантэксце пашырэнне НАТО прывядзе да канчатковай страты ёю суверэнітэту, які і без таго ўжо падарваны апошнімі гістарычнымі ініцыятывамі.

Прадстаўнікі ж НАТО, АБСЕ, заходніх краін усяляк імкнуліся пераканаць прысутных у тым, што НАТО — гэта абарончая арганізацыя і яе пашырэнне ніякай пагрозы Расіі і яе саюзнікам па СНД не прынясе. Часам здавалася, што НАТО — дабрачынная структура, але са сваёй спецыфікай.

Аднак красамоўнасць заходніх прамоўцаў не пахіснула пазіцыю Беларусі наконт гэтага вельмі сур'ёзнага выкліку сучаснасці. Валерый Цапкала, першы намеснік міністра замежных спраў, азнаёміў з афіцыйным пунктам погляду. Тым не менш, яго выступленне не нагадвала сухую заяву, пераказ пазіцыі вышэйшага кіраўніцтва краіны, а было больш падобна на філасофскае асэнсаванне гэтай складанай з'явы. Намеснік міністра, у прыватнасці, адзначыў, што ў Беларусі наконт абмяркоўваемай праблемы існуе кансенсус: ніводная палітычная сіла не выступае за пашырэнне НАТО.

А выношваемыя на Захадзе падобныя планы ён ахарактарызаваў як працяг рэалізацыі асобнымі краінамі геапалітыкі, калі ўзнікае моцная спакуса выкарыстаць выключна зручны момант слабасці дзяржаў СНД, наяўнасці супярэчнасцей паміж імі. І такім чынам «дацісную» былога працаўніка, выключыць яго з актыўнай еўрапейскай палітыкі ў галіне бяспекі і перараз мяркаваць сілы на сваю карысць шляхам уключэння шэрага краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ў НАТО.

Але гэта цвярозая і слушная, на мой погляд, думка не знайшла падтрымкі ў некаторых удзельнікаў канферэнцыі. Прадстаўнік Літвы, напрыклад, заявіў, што пашырэнню НАТО няма альтэрнатывы, як няма альтэрнатывы і пашырэнню Еўрапейскага саюза. Таму Літва гарантыі сваёй бяспекі бачыць толькі з боку НАТО.

Паўло Жаўнірэнка, дырэктар праграм па міжнароднай палітыцы і бяспецы кансультатыўнага савета пры прэзідыуме Вярхоўнай Рады Украіны, таксама не бачыў пагрозы для сваёй краіны ад пашырэння НАТО. І ўвогуле, прадстаўнікі Украіны гаварылі, што яна не можа выступаць супраць пашырэння НАТО, бо для гэтага няма аб'ектыўных прычын. А з другога боку, Украіна не можа ўжо чатыры гады наладзіць нармальнага супрацоўніцтва з Расіяй, адкуль яна адчувае больш небяспекі, чым з боку НАТО.

Дыскусія вакол пашырэння НАТО яшчэ раз паказала, што гэта праблема можа стаць сур'ёзнай перашкодай для ўсталявання трывалай бяспекі ў Еўропе, калі не будуць знойдзены разумныя кампрамісныя рашэнні, якія б улічвалі інтарэсы ўсіх бакоў.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

У СВЕЦЕ

ПЕЛЕНГ-НАВІНЫ

ЕЎРОПА ПАДТРЫМАЕ Ў РАСІІ ТОЛЬКІ ДЭМАКРАТЫЮ

Генеральны дырэктар Міжнароднага валютнага фонду Мішэль Камдэсю лічыць, што перамога Генадзя Зюганава на прэзідэнцкіх выбарах у Расіі сарве праграму эканамічных рэформаў. Па словах Камдэсю, перадвыбарчая праграма Зюганава мае пад сабой нацыяналізацыю прыватызаваных прадпрыемстваў, а гэта супярэчыць умовам, на якіх МВФ прадаставіў Расіі пазыкі. Як паведаміла Бі-бі-сі, у сувязі з маючымі адбыцца выбарамі ў Расіі міністры замежных спраў краін — удзельніц Еўрапейскага саюза прынялі ў Бруселі праграму падтрымкі і замацавання дэмакратычных рэформаў і пераходу Расіі да рыначнай эканомікі.

ЛЁС СВЯТАРОЎ ДАГЭТУЛЬ НЕВЯДОМЫ

Маскоўскі патрыярхат распаўсюдзіў заяву, у якой паведаміў пра тое, што рэшткі чалавека ў адзенні святара, знойдзеныя ў Інгушэціі, не належаць ні знікшаму святару Анатолю Чэстаўтаву, ні супрацоўніку аддзела знешніх сувязей патрыярхату Сяргею Жыгуліну. Заключэнне аб гэтым было зроблена спецыяльнай камісіяй. Абодва вышэйназваныя святары былі захоплены ўшчэ 29 студзеня гэтага года невядомымі асобамі па дарозе з горада Урус-Мартана, і іх месцазнаходжанне да гэтага часу невядома.

АДЧАЙ ВЫМУСІЎ УЦЕКАЧОЎ ВЫСКОКВАЦЬ ЗА БОРТ

Карабель з 3-4 тысячамі ліберыйскіх уцекачоў вярнуўся ў адзін з портаў Ганы. У панядзелак пасля патрабавання ўладаў Ганы карабель быў адпраўлены ў мора, але перад адплыццем каля 250 чалавек сталі выскокваць за борт на суседнюю баржу. Паводле некаторых паведамленняў, яны грамадзяне Ганы, аднак карэспандэнт Бі-бі-сі сведчыць, што ўсе яны ліберыйцы.

І НЕБА АЗАРЫЛАСЯ ЧЫРВАННЮ

Моцны шторм у Бангладэш разбурыў некалькі вёсак на поўначы краіны. Паводле першых звестак, загінула 160 чалавек і некалькі тысяч атрымалі раненні. Як сведчаць відавочцы, падчас праходжання двух тарнада праз тэрыторыю неба над ёй азарылася чырванню. Вайсковыя падраздзяленні Бангладэш вядуць выратавальныя работы, якія ўскладняюцца абрывам ліній электрапередач.

ШЫРАК НАВЕДАЎ БРЫТАНІЮ

Прэзідэнт Францыі Жак Шырак з афіцыйным візітам прыбыў учора ў Брытанію, дзе правядзе перамовы з прэм'ер-міністрам Мэйджарам і выступіць перад дзвюма палатамі парламента. На сустрэчах будуць закрануты пытанні супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, у барацьбе з міжнароднай злачынасцю і тэрарызмам. Таксама будуць разгледжаны пытанні палітычнай і эканамічнай інтэграцыі ў саставе аб'яднанай Еўропы.

ПАСЛЯ СМЕРЦІ ДУДАЕВА ШЭРАГІ ЯГО ПРЫХІЛЬНІКАЎ ПАПОЎНІЛІСЯ

Колькасць узброеных фарміраванняў дудаеўцаў у Чачні перавышае 10 тысяч чалавек, паведаміў у аўторак Інтэрфаксу экс-спікер парламента Чачні Юсуп Сасламбекаў. Сасламбекаў сцвярджае, што пераемнік Дудаева Яндарбіеў упэўнена кантралюе сітуацыю.

Радыё «Свабода», «Голас Амерыкі», Радыё 101,2 і «Радыё-РОКС» слухаў Сяргей ПРОТАС.

ІНФАРМ-КАКТЭЙЛЬ

У кітайскіх кварталах Лос-Анджэлеса і Сан-Францыска прайшла мода на опіум. Цяпер наведвальнікі начных прытонаў лічаць за лепшае «лавіць кайф» з дапамогай «жывога наркотыку» — дробных маларухомых чорных павучкоў. Гэтых насякомых запускаюць сабе ў ноздры. Павучкі вядзяляюць рэчыва, пара якога робіць наркатычнае ўздзеянне на нервовыя клеткі галаўнога мозгу.

Радзіма павучкоў — глухія джунглі Тайланда. Вылоўліваць іх вельмі складана. Таму кошт жывога наркотыку на сусветным рынку застаецца вельмі высокім.

«Фігара».

«Самае незвычайнае правапарушэнне ўчыніў жыхар кітайскай сталіцы, які вырашыў скончыць жыццё самагубствам на пекінскім вакзале. Выбуховае ўстройства, з дапамогай якога ён меў намер адысці ў іншы свет, параніла яго, не прынёсшы людзям вакол ніякай шкоды. Тым не менш, суд пастанавіў, што самагубца парушыў грамадскі парадак і сваім учынкам «аказаў дрэнны ўплыў па акружаючых». Яго прыгаварылі да 8 гадоў турэмнага зняволення.

«Маскоўскі час».

Больш за ўсіх праляжала ў коме амерыканка Элен Эспазіта. У шасцігадовым узросце 6 жніўня 1941 года ў чыкагскай клініцы ёй выдалілі апендыкс. Дзяўчынка страціла прытомнасць і памёрла толькі 25 лістапада 1978 года.

«ЭКСПРЭС-газета».

ТРАГЕДЫЯ

ПЯЦІГАДОВЫ ЗАБОЙЦА

Злачыннасць маладзее, гэта ўжо стала аксіёмай. Ужо не адзінкавыя выпадкі ўдзелу 12-13-гадовых хлапчукоў у наўмысных забойствах як сваіх аднагодкаў, так і больш дарослых. Можна спаслацца на цяжкасці нашага штодзённага жыцця, хібы ў выхаваўчай рабоце школы і сям'і.

Негатыўнае ўздзеянне аказвае на моладзь і культ жорсткасці, які дэманструецца амаль у кожнай кінастужцы. Мала хто ведае, які ўплыў усё гэта аказвае на псіхіку і паводзіны непаўналетніх, але ўзровень, мяркуючы па матэрыялах, якія маюць праваахоўныя органы, не самы станоўчы. Усё больш жорсткасць і здзекі над слабымі праяўляюцца ў паводзінах навучэнцаў школ, тэхнікумаў.

Каля 8 гадзін вечара ў Чашніцкай цэнтральнай раённай бальніцы памёр ад страты крыві вучань 2 класа Грынькоўскай СШ Дзмітрый Бакан. Дыягназ — рэзаная рана пярэдняй паверхні шыі, траўматычны шок, моцны крывацёк. Хлопчык памёр прама на руках урачоў.

Супрацоўнікі пракуратуры і міліцыі, якія прыбылі для высвятлення абставінаў, з цяжкасцю паверылі ў тое, што здарылася. Дзеці гулялі на вуліцы. Дарослых побач не было. Паміж дзецьмі ўзнікла спрэчка. Дзмітрый паваліў пяцігадовага Міхаіла Дубянца на зямлю. Падняўшыся, Міхаіл узяў нож, што быў у дзяцей, і ўдарыў Дзіму ў шыю. І як фінал — смерць.

Вядома, у ходзе праверкі больш падрабязна будуць высветлены абставіны і прычына таго, што адбылося, але яшчэ раз варта напомніць бацькам: не пакідайце дзяцей без нагляду.

Аляксей ТАРАНАЎ,
старшы памочнік Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь.

ДЗЕЦІ-АХВЯРЫ: ТРЫВОЖНЫЯ ЛІЧБЫ

Апошнім часам у беларускіх медыкаў асаблівую заклапочанасць выклікае рост у рэспубліцы выпадкаў рака шчытападобнай залозы ў дзяцей.

Толькі ў 1994 годзе захворванне на рак шчытападобнай залозы ў Беларусі склала 3,0 на 100 тысяч дзіцячага насельніцтва (у краінах Еўропы гэты паказчык не перавышае 0,5 на 100 тысяч дзяцей). Статыстычныя даныя такія: калі з 1966 па 1985 год было прааперыравана 21 дзіця з выпадку рака шчытападобнай залозы, то за перыяд 1986—1994 гг. — 329, у тым ліку: 1986—1989 гг. — 19; 1990 г. — 29; 1991 г. — 59, 1992 г. — 67; 1993 г. — 71; 1994 г. — 84 дзіцяці. Ад агульнай колькасці прааперыраваных з прычыны рака шчытападобнай залозы дзяцей 57 працэнтаў жылі ў Гомельскай вобласці, 17 працэнтаў — у забруджаных раёнах Брэсцкай вобласці.

Рост захворвання на рак шчытападобнай залозы абазначыўся даволі хутка пасля чарнобыльскай катастрофы (праз 4-5 гадоў) у параўнанні з аналагічнымі сітуацыямі (напрыклад, у Хірасіме), дзе пасля атамнай бамбардзіроўкі прайшло 10—15 гадоў. Гэта разнавіднасць рака характарызуецца тым, што пухліна вельмі хутка дае метастазы ў лёгкія і не паддаецца традыцыйным метадам лячэння.

Аляксандр МАКАРАЎ.

СІТУАЦЫЯ

КАРОТКІ КУРС НАВЕЙШАЙ ГІСТОРЫІ ВЯСКОВАГА КРЫМІНАЛУ

За апошнія гады ў шмат каго з беларускага калгасна-саўгаснага начальства склалася моцная традыцыя абвінавачваць ва ўсіх бедах аграпрамысловага комплексу то дрэннае надвор'е, то «цэнавыя нажніцы», то развал СССР. З году ў год сельская гаспадарка атрымлівае шматмільярдныя дзяржаўныя крэдыты, якія так і не вяртаюцца. І не дзіўна, што рынак, альбо, дакладней, рыначны сацыялізм, так і не навучыў многіх кіраўнікоў АПК працаваць эфектыўна. Асноўны закон сацыялізму, як яны яго разумеюць: усё вакол калгаснае, а значыць, нічыё — працягвае дзейнічаць.

Яскравым сведчаннем таму з'яляюцца вынікі праведзеных раённымі і міжраённымі пракурорамі праверак стану законнасці ў сферы аграпрамысловага комплексу Беларусі.

Вось толькі некаторыя найбольш характэрныя парушэнні заканадаўства, якія выявілі супрацоўнікі пракуратуры.

РАНІЦАЙ — КРЭСЛЫ, УВЕЧАРЫ — ГРОШЫ

Ёсць, аказваецца, у нашай краіне прасцякі, якіх лёгка можна абвесці вакол пальца па даўно вядомай, зусім простай схеме незабыўнага А.Бендэра: раніцай — крэслы, увечары — грошы.

Хоць ужо колькі разоў паведамлялася ў сродках масавай інфармацыі, што сёння пры дзелавых узаемаадносінах з партнёрамі па бізнесу трэба быць вельмі абачлівым. Тым не менш, некаторыя кіраўнікі калгасаў і саўгасаў, нібы зачараваныя, падпісваюць з рознымі прайдзісветамі кантракты, якія прыносяць гаспадаркам шматмільённыя страты.

У мінулым годзе саўгасам «Янава» Веткаўскага раёна была заключана дамова з расійскім прыватным прадпрымальнікам спадаром Цішчанкам. Згодна з гэтым дакументам бізнесмен абавязваўся паставіць гаспадарцы запасныя дэталі да камбайна у абмен на 15 камплектаў мэблі. Саўгас адгрузіў у Расію мэблю на суму 72 мільёны рублёў, а запчастак так і не атрымаў. Праўда, акт прыёму-перадачы запасных частак чамусьці быў складзены.

Старшыня калгаса «Пераможца» Ляхавіцкага раёна заключыў «бартэрную» здзелку з фірмай «Прамдызайн». Калгас яшчэ ў 1993 годзе адгрузіў фірме 216 тон бульбы, аднак абяцанага камбайна «Дон» не атрымаў і да гэтага часу. А старшыня гаспадаркі чамусьці нават не спрабаваў прыняць меры па спагнанню доўгу з фірмы «Прамдызайн». Зрэшты, пэўна, не зусім справядліва было лічыць кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў зусім наіўнымі і недальнабачнымі людзьмі. Вельмі часта яны наўмысна трапляюць на вуду нашчадкаў А.Бендэра.

Напрыклад, саўгасам «Дубовіцкі» Буда-Кашалёўскага раёна быў заключаны кантракт з санкт-пецярбургскім ТАА «Яні». Згодна з дамовай саўгас паставіў фірме больш за 15 тон сыру на суму 401,2 мільёна рублёў, ды яшчэ і аплацію транспартных выдаткі, якія склалі 23 мільёны рублёў. У парушэнне існуючых правілаў у кантракце не былі абумоўлены ні тэрміны пастаўкі, ні цана, ні штрафныя санкцыі за невыкананне дагаворных абавязацельстваў. І ўсё гэта, відавочна, было пакінута па-за ўвагай не выпадкова, бо дырэктар саўгаса, атрымаўшы плату толькі за 11 тон сыру наяўнымі расійскімі рублямі, у касу ўнёс беларускімі. У выніку гаспадарка панесла страты ў суме 130 мільёнаў рублёў.

Дарэчы, гэтая ж фірма не разлічылася з саўгасам і за 25 тон бульбы. Кіраўніцтва гаспадаркі чамусьці не палічыла неабходным патрабаваць перадаплату, а таму ў саўгасную скарбонку не трапіла 52,7 мільёна рублёў.

Дырэктар саўгаса «Барок» Магілёўскага раёна спадар Скобелеў заключыў дагавор куплі-продажу жыта з ТАА «Барк». За хабар у памеры 400 долараў кіраўнік гаспадаркі «забыўся» ўключыць у дагавор такія істотныя ўмовы, як колькасць прадаваемага збожжа, тэрміны аплаты і адказнасць бакоў за невыкананне дагавора.

ДАВЯРАЙ, АЛЕ ПРАВЯРАЙ

Складваецца такое ўражанне, быццам некаторыя кіраўнікі калгасаў і саўгасаў настолькі даверлівыя, што могуць заключыць здзелку з першым стрэчным. Дастаткова толькі больш- менш кемлівому прайдзісвету паабяцаць «залатыя горы» і паказаць які-небудзь квіток.

Так, па загаду дырэктара (цяпер ужо, праўда, былога) Хойніцкага сыраробнага камбіната было адгружана маскоўскай фірме «Дзіяна» 40 тон масла на суму 1,033 мільярда рублёў. Грошы камбінат так і не атрымаў, а плацежныя дакументы, як выявілася, былі фіктыўнымі.

Амаль аналагічным спосабам нейкі расійскі прайдзісвет абдурыў Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат на 1,4 мільярда рублёў.

ЧЭСНАЕ МАХЛЯРСКАЕ

Некаторыя кіраўнікі гаспадарак наогул не абцяжарваюць сябе клопатамі заключэння якіх-небудзь пісьмовых дамоў з партнёрамі па бізнесу. Не дзіва, што, атрымаўшы прадукцыю, такія кампаньёны бясследна знікаюць.

Аграфірма «Зара» Мядзельскага раёна проста так, пад «чэснае слова» адгрузіла нейкай грамадзянцы Яршовай, якая прадставілася прэзідэнтам фірмы «Арліца», больш як 4 тоны свініны на суму 61,7 мільёна рублёў. Зараз прадпрымальную «арліцу» шукае міліцыя, а «Зара» падлічвае страты.

Калгас «Маяк» Карэліцкага раёна таксама без заключэння кантрактаў на працягу мінулага года пастаўляў санкт-пецярбургскай фірме «ІСТ» бульбу, масла, сыр. Спачатку расійскія бізнесмены неяк разлічваліся за тавар наяўнымі грашыма, а потым палічылі непатрэбным плаціць. У выніку калгас да гэтага часу не можа атрымаць ад фірмы 269,1 мільёна рублёў за пастаўленую прадукцыю.

КУДЫ ІДУЦЬ КРЭДЫТЫ?

Відавочна, ні для кога не сакрэт, што выбітныя аграрным лобі крэдыты не заўсёды выкарыстоўваюцца па прамому прызначэнню. Ды і просяць «чырвоныя паны» грошай у дзяржавы часам значна больш, чым патрэбна.

У калгасе «Наша перамога» Бялыніцкага раёна цяпер ужо былы старшыня Кутэнка выкарыстаў 14 мільёнаў крэдытных сродкаў на рамонт калгаснага аўтамабіля, хоць грошы гэтыя былі выдзелены з бюджэту на нарыхтоўку кармоў.

Старшыня калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Аршанскага раёна спадар Лагуноў выкарыстаў для пасадкі на асабістым прысядзібным участку больш як тры тоны элітнай бульбы, якую калгас закупіў для сваіх патрэб эксперыментальнай базе «Вусце».

З мэтай атрымання як мага больш крэдытных рэсурсаў, а таксама датацый і кампенсацый некаторыя кіраўнікі гаспадарак наўмысна завышаюць свае патрэбнасці.

Наогул, пад час пракурорскіх праверак выявілася, што ў мінулым годзе не па прызначэнню было выкарыстана крэдытных рэсурсаў на суму 1 мільярд 952 мільёна рублёў. У асноўным гэтыя бюджэтныя грошы былі затрачаны на набыццё аўтамабіляў, тавараў народнага спажывання...

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ГОРШ І НЕ ПРЫДУМАЕШ

КАШАЙ НА ВАДЗЕ

— так кармілі дзетак некалькі дзён у некаторых мінскіх садках

— Вадзімка, нешта не пазнаю я цябе. Ніколі пасля садка ты так ахвотна не еў. Што, тая ежа табе не даспадобы? Ці не хапае?

— Не хапае. А сёння нам супу зусім не давалі. Быў толькі гарох (Вадзімка мае на ўвазе зялёны гарошак). Зусім мала, і рыбныя кансервы. Мы іх з хлебам елі.

Такі вось дыялог адбыўся ў мяне з маім шасцігадов

Сядзіба

Выпуск № 335 Рубрыку вядзе Мікалай ЧАХОЎСКІ

КУРЫЦА НА ПАСАДУ ... МАМЫ

Прырода пра многае паклапацілася сама, рыхтуючы меры па збяражэнню роду. Возьмем курэй. Уважлівыя гаспадары адразу заўважаць, якая з асобін гатова сесці на яйкі, выводзіць маладое племя. І не толькі таму, што заквактала. Яе паводзіны сталі нервова-клапатлівымі, пер'е раптам стала дыбна, галава клапатліва апушчана долу. Падобная асобіна так і імкнецца залезці ў гняздо. Здараецца, яна знаходзіць зацішнае месца ў дрывотні ці на агародзе і паціху адкладвае там уласныя яйкі. Пасля садзіцца і выводзіць куранят.

З гэтай нагоды многія спецыяльна кладуць 3-4 яйкі ў гняздо, каб стымуляваць наседжванне. А яшчэ садзяць курыцу на гняздо сілком і накрываюць кошыкам без ручкі ці нейкай скрынкай так, каб выбранніца на пасаду мамы не магла стаць на ногі. І церпіць небарака. Ды як пакорліва!

А якая квактуха найлепшая? І тут ёсць свае «тонкасці». Па-першае, каб была даволі сталай. Маладыя шалахвосткі для гэтага не падыходзяць. Па-другое, лепш мясцовыя і беспародныя. Інкубатарскія выводзіліся не для мацярынства. Іх задача — даць 300 і больш яек у год. Па-трэцяе, хаця б 3-4 дні садзіць на гняздо прымусова, выпускаючы на волю раз у суткі для кармлення, паення і туалета. Нарэшце, экзамен ваша выбранніца вытрымала. Цяпер можна класці яйкі. Іх колькасць залежыць ад надвор'я. Цёпла — можна вылажыць 14—17 штук, абавязкова ў адзін слой, холадна — норму зменшыць на два — чатыры экземпляры.

Выкарыстоўваць толькі «сямейныя» яйкі (ёсць бадзёры, пародзісты певень).

Але і яшчэ адна мера не зашкодзіць — праверыць «тавар» на святло. У любой кардоннай каробцы зрабіць некалькі адтулін па памеры яйца (не правальваюцца). Унутр каробкі ўставіць элекралямпачку на сто ват. На адтуліну класці яйкі і прасвечваць. Звяртаць увагу на абалонку (ці не трэснутая), ці няма крывавых і наогул цёмных плям, ці на месцы паветраная праслойка (яна ў тупым канцы).

Браць для наседжвання толькі свежыя яйкі, не больш як 7—10-дзённыя. Адабраныя экземпляры захоўваць да інкубацыі пры тэмпературы 10—12 градусаў і абавязкова праветрываць іх.

«ГРАДКІ» ДЛЯ ДАПЫТЛІВЫХ

У канцы мінулага месяца выйшаў з друку красавіцкі нумар газеты «ДЛЯ ВАС» (№19). Ён прысвечаны садоўніцтву. Брашура разаслана падпісчыкам і паступіла ў кіёскі «Саюздруку».

Усе папярэднія выпускі — пра сяўбу і нітраты, угнаенні, насенняводства, як атрымаць тону памідораў з соткі, замежныя тэхналогіі — можна заказаць ў рэдакцыі (выпускі №№ 15 — 19). Хто жадае мець іх у сваёй бібліятэчцы, з любога паштовага аддзялення пералічвае грошы на разліковы рахунак газеты «Звязда» ў АКБ «Белбізнесбанк». Цана аднаго экземпляра — 4000 руб., двух і болей — па 3,5 тысячы рублёў. Розніца выклікана коштам заказных адпраўленняў.

На пераводзе ўкажыце: адрас рэдакцыі з індэксам **(220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда»)** і паметку аб пералічэнні грошай **(наш разліковы рахунак 3012210270016, код 739 у АКБ «Белбізнесбанк»)**, укажыце, якія брашуры жадаеце набыць, іх нумары. Як толькі атрымаем пераводы, вам будуць высланы выданні. Не забудзьце разборліва напісаць свой адрас з індэксам, прозвішча, імя і імя па бацьку. Дзе можна набыць нашы выданні? У абласцях гэтага зрабіць нельга. У Мінску брашуркі для дачнікаў ёсць у магазінах «Насенне», «Сельгаскніга» (праспект Скарыны), «Аграхімік» (вул. Чырванаазорная, 8). Цэны тут самыя нізкія — адзін экземпляр каштуе 3000 руб.

ТУТ ПРАДАЮЦЦА САДЖАНЦЫ

У сваіх пісьмах чытачы пытаюць, дзе набыць пасадачны матэрыял. Адказ напрошваецца такі: найбольшы выбар на базарах. Толькі ў прадаўцоў пытаць адпаведныя гарантыйныя дакументы-даведкі.

Таварыства «Сад» (горад Мінск) мае свой магазін «Дачнік» (вуліца Прытыцкага), у якім можна і «тавар» набыць, і атрымаць кансультацыю. Падобныя гандлёвыя кропкі існуюць ва ўсіх абласных цэнтрах.

Прыводзім адрасы найбольш вядомых сельскагаспадарчых арганізацый, дзе гадуюць высакаякасны пасадачны матэрыял для дачнікаў і сялян.

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Абласная доследная станцыя. 225140, г. Пружаны, вуліца Урбановіча, дом 5. Тэлефон прыёмнай: 2-23-71 ці 2-25-01.

Саўгас Чарнышова. 225320, Баранавіцкі раён, вёска Петкавічы. Тэлефоны: 3-91-45 і 3-91-73.

Калгас імя Леніна. 225532, Столінскі раён, вёска Беражное. Тэлефоны: 4-13-18, 4-12-96.

Саўгас «Рассвет». 225030, Брэсцкі раён, вёска Вінічы. Тэлефоны: 91-91-45, 56-66-89.

ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Эксперыментальная база «Руткевічы». 231553, Шчучынскі раён, вёска Руткевічы. Тэлефоны: 3-85-16, 3-85-34.

Занальны навукова-доследны інстытут сельскай гаспадаркі. 231510, г. Шчучын, Акадэмічная, дом 21. Тэлефоны: 2-19-52, 2-19-59.

Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. 230600, г. Гродна, вуліца Церашковай, дом 26. Тэлефон: 47-14-97.

Калгас «Прагрэс». 231751, Гродзенскі раён, вёска Верцялішкі. Тэлефоны: 99-45-67, 99-44-32.

ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Дзяржаўная выпрабавальная станцыя. 211311, Віцебскі раён, вёска Лужасна. Тэлефон: 98-52-37.

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Саўгас «Іскра». 247500, Рэчыцкі раён, вёска Холшыц. Тэлефоны: 9-10-30, 9-10-10.

МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Абласная доследная станцыя. 213300, Магілёўскі раён, вёска Дашкаўка. Тэлефон: 99-21-73.

Сельгасакадэмія. 213410, г. Горкі, вуліца Мічурына, дом 5. Тэлефоны: 2-14-64, 2-16-50.

МІНСК І МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Беларускі інстытут аховы раслін. 223011, г. Мінск, п/а Прылукі, тэлефон: 99-23-39.

Саўгас «Дэкаратыўныя культуры». 222000, г. Мінск, вуліца Прытыцкага, дом 59. Тэлефон: 56-95-80.

Батанічны сад. 220012, г. Мінск, вуліца Сурганава, дом 2а. Тэлефон: 2-68-44-84.

Эксперыментальная база «Русінавічы». 223013, Мінскі раён, п/а Самахвалавічы. Тэлефон: 90-14-46.

Беларускі навукова-доследны інстытут. 223013, Мінскі раён, п/а Самахвалавічы. Тэлефон: 90-11-40.

* * *

Акрамя пералічаных, саджанцы гадуюць у многіх сельскагаспадарчых тэхнікумах, вучылішчах, дзяржаўных установах і сельгасстанцыях. Звязвайцеся з імі па мясцовым тэлефоне.

НАРЫХТОЎКА ЗЯЛЁНАГА ГАРОШКУ НА ЗІМУ

Абавязковы адбор здаровых асабін, мыццё ў халоднай вадзе (выкарыстоўваецца друшляк). У гэтым жа друшляку (у марлі, анучцы) акунаць на 3 хвіліны ў кіпень (запраўлены соллю і цукрам — па 1,5 сталовай лыжкі з верхам таго і другога на адзін літр вады). Гарачы гарох ссыпаюць у слоікі (0,5 л, 1 л), заліваюць зноў гарачым растворам, у якім бланшыравалі сваю прадукцыю. На кожны літр вадкасці кладуць дадаткова 3 г лімоннай кіслаты. Вадкасць не дастае да верху 1 см. Кладзём накрыўку і ставім у каструлю, у якой наліта падагрэтая да 70 градусаў і крыху саленаватая вада. Стэрылізацыя ідзе пры слабым «бульканні»: 0,5-літровыя слоікі трымаць да 3—3,5 гадзіны. Адразу закатваць.

У паўлітровую банку ўваходзіць 630—650 г гарошку і 170—180 г заліўкі.

Найлепшыя вынікі дае кансерваванне сорту «Жэгалава-112». Ён выспявае крыху пазней, але гарошыны на ўсе сто — буйныя, салодкія. Сцябліны да 1,5—2 метраў. Стручкоў на іх процьма. А калі збор зменшыцца, падкарміць каравяком (1:8) з дабаўленнем на вядро 10 г мачавіны. Будзе яшчэ адзін, але не такі багаты.

Звяртаемся да нашых чытачоў з просьбай дасылаць свае рэцэпты. Абавязкова іх надрукуем.

ГЭТЫЯ ВЫДАТНЫЯ ШАЛАШЫКІ

Вельмі многія агароднікі майструюць лёгкія і зручныя ўкрыцці-шалашыкі. Забілі чатыры калкі, прыбілі жэрдачкі, нацягнулі па іх шпагат, а зверху накінулі плёнку. Вось і ўсё. Застаецца толькі замацаваць з краёў і па баках. Вышыня такога збудавання — ад 1,8 да 1,5 м па баках. Кожная раслінка накіроўваецца ўверх па «сваім» шпагаце. Яна так учэпіцца вусамі, што і не адарвеш.



Зямлю ўнутры пажадана ўгнаіць каравяком ці конскім гноем. Вядома, лепш крышачку перапрэлым. На пагонны метр — вядро. Дадаць комплекснае ўгнаенне (два карабкі) і шклянку прасеянага попелу. Усё — на той жа пагонны метр. Шырыня да 40 см. Угнаенні павінны быць закапаны на глыбіню лапаты.

Сеяць насенне толькі прарошчаным, адно ад другога на адлегласці 30 см, а радок ад радка — 85—95 см.

Кожная расліна павінна даць 30 агурочкаў. Гэта так званы сярэдні паказчык. Дамагліся больш высокіх вынікаў — гонар вам і пашана.

ЗГІНЬЦЕ, ШКОДНІКІ!

Апошнім часам у кватэрах з'явіліся зялёныя сябры — цытрусавыя. Гэта лімон Меера, паўлаўскія лімоны і інш. Як і любыя расліны, яны маюць патрэбу ў абароне ад шкоднікаў. Імі з'яўляюцца: кляшчы, шчытоўкі і лжэшчытоўкі, тля.

Кляшчы — 0,3—0,7 мл даўжынёй — знешне падобныя на звычайных павучкоў, селяцца на ніжняй паверхні лісця і парасткаў. Рудаватыя, з жоўтым або чырванаватым адценнем. Неверагодна хутка размнажаюцца — 10 і болей пакаленняў.

Шчытоўкі і лжэшчытоўкі найбольш небяспечныя шкоднікі, бо ахаваны «бранёй» — васковым налётам. Рудыя або шаравата-фіялетавыя, памерам 5 мм.

Тля — бяскрылыя дробныя насякомыя ад 1 да 3 мм, жоўта-зялёнай, часам бурай афарбоўкі. Селячыся шматлікімі калоніямі на маладым лісці, парастках і пупышках, яны літаральна іх аблепліваюць, забіраючы сокі раслін. Калі сістэматычна не весці з імі барацьбу, то пакаёвыя дрэўцы марудна растуць, слабеюць, лісце заўчасна ападае і расліны нярэдка гінуць.

Прафілактычна расліны можна апрацоўваць растворам зялёнага мыла, а то і проста пральным парашком. Працэдуру паўтарыць некалькі разоў з інтэрвалам у некалькі дзён.

Дапамагае таксама апрацоўка дрэўцаў медна-мыльным растворам: 25 г меднага купарвасу плюс 75 г пральнага парашку або 200 г гаспадарчага мыла на 10 л вады.

Паспрабуйце яшчэ такі спосаб: працёрці расліну мяккай губкай або шчоткай, намочанымі ў слабым растворы воцату. Некаторыя лічаць за лепшае апырскваць з пульверызатара неразбаўленым (!) ацэтонам супраць шчытовак і кляшчоў.

Супраць тлі можна выкарыстаць настоі і адвары некаторых раслін. Напрыклад, 100 г шалупіння цыбулі заліць 5 л вады і настойваць двое сутак. 50 г здробненых зубкоў часнаку заліць гарачай вадой (300 г) і настойваць 5 сутак у цёмным месцы. Працадзіць. Да кожных 50 г настою дабаўляць столькі ж мыла і разбаўляць 10 літрамі вады. Апырскваць дрэўцы раз у тыдзень.

Гэтымі ж растворамі можна карыстацца пры апрацоўцы ружаў, астраў.

СПАДЧЫНА

ДВА ЖЫЦЦІ «БЕЛАРУСКАЙ ХАТКІ»



У сё атрымалася, можна сказаць, выпадкова. Я проста гартала сёлетні перакідны каляндар, што ляжыць на рабочым стале. Сярод шматлікіх юбілейных дат, якія мільгалі перад вачыма, маю увагу прыцягнула адна з іх. Па-першае, гэта быў юбілей не чалавека (а ў календары такія запісы трапляюцца значна радзей, чым радкі аб дні нараджэння вядомых і не зусім асоб). Там жа было напісана, што 80 гадоў сёлета спаўняецца «Беларускай хатцы» — клубу нашай мастацкай інтэлігенцыі. Па-другое, мяне неяк бянтэжыла назва клуба — «Беларуская хатка». У памяці ўсплыў невялікі драўляны домік у сучасным Мінску, непадалёк ад майго факультэта, на вуліцы Рабкораўскай — філіял музея Максіма Багдановіча. Яго таксама называюць зараз «Беларускай хаткай». Значыць, «юбілярка» жывая да сённяшняга дня? Але бяздушныя літары і лічбы ў календары запэўнівалі, што тая «хатка», якой сёлета 80, праіснавала ўсяго чатыры гады — з 1916-га па 1920-ы. Чаму ж сёння так завецца філіял музея? Можа, гэта проста плагіят? Не, такога не можа быць... Можа, «хатка» адрадзілася? Ці музей сёння — спадкаемца ідэй таго клуба?.. Сорамна, але я вельмі мала ведала пра сённяшнюю «Беларускую хатку» і тым больш пра тую, што існавала 80 гадоў таму. Зразумеўшы, што адной тут не разабрацца і лепш за ўсё пабачыць і пагутарыць з дасведчаным чалавекам, я накіравалася на вуліцу Рабкораўскую...

Калі я зайшла ў «хатку» і сказала, што хачу пабачыць гаспадара, г. зн. загадчыка, мяне папрасілі крыху пачакаць: «Ён паказвае студэнтам батлейку. Калі хочаце, можаце паглядзець і вы». Вядома ж, я хацела. Мяне правялі ў невялікі пакой, абсталяваны пад маленькую, так званую камерную (чалавек на 40—50), глядзельную залу. На пярэдніх лаўках сядзелі сем ці восем дзяўчат (як я потым даведалася, гэта былі студэнты універсітэта культуры, будучыя музеязнаўцы). Яны з дзіцячым захапленнем глядзелі на пацеху, што прыйшла да нас з глыбіні стагоддзяў — мініяцюрны лялечны тэатр батлейку. Спачатку соп-распінаўся папулярны герой беларускіх батлеечнікаў — цар Ірад. Потым былі тыповыя для мінулага стагоддзя пары — прадстаўнікі местачковых саслоўяў (яўрэй з яўрэйкай, цыган з цыганкай, паніч з паненкай). Яны размаўлялі невялікімі дасціпнымі дыялогамі, а пасля танцавалі, смешна падскокваючы і паварочваючыся. Відовішча сапраўды захапіла, і я зразумела, што тут сапраўды можна адчуць сябе калі не дзіцем; дык жыхаром мястэчка гадоў гэтак сто пяцьдзесят назад.

Але казка скончылася, і да нас выйшаў той, хто яе ствараў, — вядомы беларускі бард Эдуард Акулін. Ён, як гаспадар «хаткі», дапамог мне высветліць ўсе дэталі і развеяў мае сумненні.

Пачыналася існаванне той, першай «хаткі» зусім не рамантычна. Быў не вельмі сыты шаснаццаты год. А ў правінцыяльным Мінску, на Захар'еўскай вуліцы, у доме нумар васемнаццаць, што недалёка ад Чырвонага касцёла, адкрылася танная сталоўка для беларускай мастацкай інтэлігенцыі. Загадчыцай гэтай дабрачыннай установы была Эмілія Сівіцкая, маці небезвядомай Зоські Верас. Туды хадзілі сталавацца Змітрок Бядуля, Ядвігін Ш., Уладзіслаў Галубок, Аркадзь Смоліч, Максім Багдановіч, які ўжо жыў у Мінску, іншыя пісьменнікі і тэатралы. Калі столькі таленавітых людзей часта збіраецца пад адным дахам — абавязкова атрымаецца нешта цікавае. Пастаянныя наведвальнікі сталоўкі сталі наладжваць вечарыны, на якіх прапаноўвалі свае новыя творы, развучвалі беларускія песні, наладжвалі танцы і гульні. Пажытак духоўны стаў важней за танны абед. Сталоўка стала клубам. Яго назвалі «Беларуская хатка».

Калі насталі спрыяльныя для беларускага адраджэння 20-я гады, у многіх пастаянных членаў «Беларускай хаткі» з'явілася рэальная магчымасць вынесці адраджэнцкія ідэі, што акумуліраваліся ў яе сценах, на дзяржаўны ўзровень. Суцэльная беларусізацыя, якая пачала праводзіцца ў той час, ліквідавала неабходнасць існавання вузкага адраджэнцкага клуба, якім была «хатка». Клуб механічна распаўся. А дом на вуліцы Захар'еўскай згарэў у далёкія 30-я гады...

Можа здацца дзіўным, але сённяшняя «хатка», калі мець на ўвазе будынак, — равесніца той, першай. А можа, нават і старэй за яе. Ва ўсякім разе, калі ў 1916 годзе Максім Багдановіч прыехаў на радзіму, яна ўжо стаяла на вуліцы Малагеоргіеўскай, і яе гаспадар Сава Рэдзька здаваў пакой Змітраку Бядулю. Апошні, пераязджаючы на новую кватэру, параіў Багдановічу заняць яго месца... У адным з пакояў хаты паэт пражыў свае апошнія дні на Беларусі...

Хату Савы Рэдзькі пашкадаваў час. Яе абмінула нават полымя Вялікай Айчыннай. І да нядаўняга часу яна стаяла на тым жа месцы, што і восемдзесят гадоў таму. Стаяла яна недагледжаная, без гаспадара. Праўда, мела на сабе нешта накшталт памятнай дошкі. А ў 1986 годзе на яе месцы было вырашана пабудаваць вялікі будынак. Старую хату хацелі проста знесці. Але рупліўцы беларускасці не дазволілі такога варварства, і іх намаганнямі хатку адсунулі на сто пяцьдзесят метраў — з вуліцы Талстога на Рабкораўскую. Тады ж узнікла ідэя адкрыць у ёй філію музея Багдановіча.

Рэалізаваць гэту ідэю змаглі толькі ў 1991 годзе, калі з'явіліся сродкі. А адразу пасля адкрыцця філіі ўзнікла ідэя новая, не менш цікавая: прадоўжыць у будынку традыцыі той, пачатку стагоддзя, «Беларускай хаткі». Аргументы былі важкія: Багдановіч быў актыўным удзельнікам клуба, там было шмат яго сяброў. Да таго ж, акрамя мемарыяльнага пакоя Багдановіча, у хаце заставаўся яшчэ адзін вялікі пакой. Яго ператварылі ў камерную залу для сустрэч, а на сценах стварылі экспазіцыю, прысвечаную гісторыі той, першай «хаткі». Адрадзілі батлейку — у першым клубе яна таксама была. Батлейку з гонарам паказваюць усім наведвальнікам музея. Гэты лялечны тэатр другі ва ўсёй рэспубліцы з'явіўся пасля працяглага забыцця. Дакладную копію магілёўскай беларускай батлейкі, што існавала 150 гадоў таму (арыгінал знаходзіцца ў адным з музеяў Санкт-Пецярбурга) зрабіў для хаткі народны майстар Алесь Лось. «Батлейка — душа «хаткі», — шчыра сказаў сп. Акулін.

Днём «Беларуская хатка» — музей. Многія яе «калегі» могуць пазайздросціць: за месяц праходзіць каля 30 экскурсій, амаль столькі ж батлеечных спектакляў. Каля тысячы наведвальнікаў штомесяц — значны паказчык для невялікага музея. Большасць з іх — вучні, самыя ўдзячныя і цікаўныя гледачы.

А вечарам «хатка» становіцца клубам сустрэч мастацкай інтэлігенцыі. Тыя, каму неабыякавая Беларушчына, стаміўшыся ад прасторнай залы Дома літаратара, нярэдка збіраюцца тут, больш вузкім колам. Наладжваюць літаратурныя гасцёўні, цікавыя сустрэчы. Гасцямі «хаткі» былі Стафанія Станюта, Алесь Камоцкі, Міхась Ткачоў, хор «Унія», гурт «Ліцвіны»... 25 чэрвеня будзе двайное свята — адзначаць пяцігоддзе новай «Беларускай хаткі» і васьмідзесяцігоддзе той, першай...

На вечарыны прыходзяць усе жадаючыя, але камерная зала ўмяшчае толькі пяцьдзесят чалавек. Хочаш не хочаш, а колькасць людзей абмежаваная. Большасць з іх ходзяць пастаянна. Атрымліваецца напалову закрыты клуб. Вузкая адраджэнцкая суполка. Як восемдзесят гадоў таму...

А вечарам «хатка» становіцца клубам сустрэч мастацкай інтэлігенцыі. Тыя, каму неабыякавая Беларушчына, стаміўшыся ад прасторнай залы Дома літаратара, нярэдка збіраюцца тут, больш вузкім колам. Наладжваюць літаратурныя гасцёўні, цікавыя сустрэчы. Гасцямі «хаткі» былі Стафанія Станюта, Алесь Камоцкі, Міхась Ткачоў, хор «Унія», гурт «Ліцвіны»... 25 чэрвеня будзе двайное свята — адзначаць пяцігоддзе новай «Беларускай хаткі» і васьмідзесяцігоддзе той, першай...

На вечарыны прыходзяць усе жадаючыя, але камерная зала ўмяшчае толькі пяцьдзесят чалавек. Хочаш не хочаш, а колькасць людзей абмежаваная. Большасць з іх ходзяць пастаянна. Атрымліваецца напалову закрыты клуб. Вузкая адраджэнцкая суполка. Як восемдзесят гадоў таму...

Як восемдзесят гадоў таму, справа Беларушчыны ў руках зусім абмежаванага кола людзей. Нічога не змянілася... Нічога не змянілася?

Можа, калі-небудзь «Беларуская хатка» стане толькі музеем. Дай жа Бог, каб гэта здарылася толькі з тае прычыны, па якой скончылася існаванне яе прамаці ў далёкія ўжо 20-я гады.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

На здымках: такой была першая «Хатка» на Захар'еўскай вуліцы цяпер яе выява — музейны экспанат; а вось такая «Хатка» сённяшняя. Яна глядзіцца крыху экзатычна на фоне каменных гмахаў сталіцы.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗДАРЭННІ

АЎТАР ПАНЯВОЛІ

Гарадскі штотыднёвік «Веснік Магілёва» пачаў друкаваць артыкулы ўкраінскага журналіста Івана Тулінскага. Сама па сабе падзея звычайная. Цікава іншае: аўтарам беларускага выдання зрабіўся наш «забугорны» калега па горкай патрэбе.

Паехаў ён разам з сям'ёй з г. Сумы ў Санкт-Пецярбург. На зваротным шляху падарожнікаў, што называецца, абчысцілі. Да Оршы дабраліся, а на далейшы шлях — ні капейкі. Жонку з дзіцем і яе сястру Іван пакінуў на вакзале, а сам падаўся здабываць грошы. Уявіце, што значыць застацца з пустой кішэняй не толькі ў чужым горадзе, але і ў чужой краіне. Яшчэ з капіталістычнымі норавамі. Ды з беспрацоўем. Ды з жабракамі, якіх і сваіх удосталь.

Словам, хапіў Іван ліха. Нідзе і ніхто на яго гора не адгукнуўся, і журналіст вырашыў гандляваць. Вядома, розумам. Ён пачаў на галодны страўнік і ва ўмовах, якія творчасці не спрыяюць, пісаць артыкулы і прапаноўваць іх мясцовым рэдакцыям. Такім чынам дабраўся да магілёўскага Дома друку.

Не трэба апладысментаў прафсалідарнасці. З тузіна газет знайшлася толькі адна, якая купіла заметкі Тулінскага і заплаціла за іх, калі можна так сказаць, авансам. Столькі, каб хапіла на чыгуначныя білеты. Тры дарослыя і адзін дзіцячы.

Івану было што прадаць. А што б іншаму бедаку было рабіць на яго месцы? З кісцянём пад мост?

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

ХОЧАЦЕ — ВЕРЦЕ...

ПАЧАЛАСЯ ЭРА ВАДАЛЕЯ

Гэты год знамянуецца пачаткам новай эпохі — эры Вадалея. Вадалей — знак паветра, які вядзе чалавека да духоўнага адраджэння і найбольш высокіх прыступак пазнання — інтуіцыі і прадбачання, таму што ён напрамую звязаны з касмічным розумам і сіламі, якія кіруюць прыродай.

Хоць многія прыпісваюць Вадалею рэвалюцыйнасць, гістарычна яго ўплыў вядзе не да крывавых путчаў і крыжовых паходаў, а, хутчэй, да кардынальнага абнаўлення грамадскага ўладкавання шляхам перагляду ўстарэлых каштоўнасцей, кансерватыўнай маралі, аджыўшых грамадска-эканамічных фармацый, якія базіруюцца на расавай, рэлігійнай і іншых відах няроўнасці. Рух за злучэнне хрысціянскіх рэлігійных канцэсій, пачаты патрыярхам усяе Русі Алексіем II і папам рымскім Іаанам Паўлам II, будзе падтрыманы ва ўсіх хрысціянскіх дзяржавах, і перагародкі, штучна ўстаноўленыя паміж людзьмі, разваляцца самі па сабе. Таксама будуць пераадолены прыватныя праблемы, закончаны міжусобныя войны, якія перашкаджаюць чалавецтву вырашаць больш агульныя гуманітарныя задачы: прадухіленне экалагічнай катастрофы, барацьба з эпідэміямі, голадам, цяжкімі хваробамі. Большасць палітычных крызісаў таксама вырашыцца мірным шляхам. Галоўнае значэнне вопыту і наогул любога закончанага ланцужка падзей заключаецца ў тым, што ў выніку ёсць плён, які трансфармуе Вадалей у глебу, на якой растуць каштоўнасці і здольнасці чалавека, і ён набірае патэнцыял для будучых буйных спраў і здзяйсненняў, а таксама істотнай унутранай перабудовы — выпрацоўкі характару, адмовы ад устойлівых дрэнных звычак, пераадолення эгаізму. Расшырэнне межаў зносінаў паміж людзьмі і павага любой асобы і яе безумоўнага права на існаванне як «любога стварэння Божага» — асноўная кармічная задача эры Вадалея.

«Домашний доктор».

ТЭЛЕБАЧАННЕ, 15 мая

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 «І смех, і бяда». Маст. фільм.
9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 9-клас. Максім Багдановіч і яго паэзія (паўтор).
9.25 «Кобра». Тэлесерыял. 1-я серыя.
10.15 «Аліса ў Краіне цудаў». Мультфільм.
10.45 «Зорная ростань». Віцебска-Мінскі тур. Перадача 19-я.
11.25 Відзьма-нявідзьма.
12.25—13.30 «Доўгі шлях у лабірынце». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.00 Навіны.
15.15 «Руская песня». Фільм-канцэрт (ВМЗ).
16.00 «Фліпер». Тэлесерыял для дзяцей.
16.25 Канцэртны сезон. Міжнародны музычны фестываль «Я люблю балет». Частка 1-я.
17.00 Крэда. Роля Нацыянальнага банка ў эканамічным жыцці Беларусі.
17.20 Госці ў хату.
17.50 Музычны антракт.
18.00 «Творцы». Да 60-годдзя пісьменніка Барыса Сачанкі.
18.25 Эканамікст».
18.35 «Тройчы па аднаму». Музычная перадача MTV.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.05 «Кобра». Тэлесерыял. 2-я серыя.
20.00 «Хто гэта?» Тэлегульня.
20.05 Супергол.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.05 «Закон Бэрка». Маст. фільм (ЗША). 5-я серыя.
23.05 Каралеўскае паляванне.
23.45 «Усмешка Леанарда да Вінчы». Мультфільм для дарослых.
24.00 Навіны.

ГРТ

5.00 Тэлераніца.
7.40 Выбары-96.
7.50 Заканадаўца.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.40 Навіны.
8.15 «Сакрэт трапіканкі».
9.05 «Тэма».
9.50 «У свеце жывёл».
10.30 «Адгадай мелодыю».
11.10 У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». «Кантакт — дзелавое супрацоўніцтва краін Садружнасці».
14.20 «Чароўныя гісторыі».
14.45 Кактус і К.
14.55 До-мі-соль.
15.10 Кліч джунгляў.
15.40 «Элен і хлопцы».
16.05 «Тэт-а-тэт».
16.30 Сем дзён спорту.
17.20 «Сакрэт трапіканкі».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мелодыю».
19.05 «Парыжскія тайны Э. Разанава». Брыжыт Бардо.
19.45 «Добрай ночы, малышы!»
20.00 Час.
20.35 Праграма перадач.
20.40 Выбары-96.
20.50 Ніна Русланава і Уладзімір Івашоў у баевіку «Рускія браты».
22.15 Новыя абывацелі.
22.45 Ілля Глазуноў: «Што застанецца пасля мяне...» Дак. фільм.

Канал «Расія»

6.15 «Дон Кіхот». Мультсерыял (Іспанія).
6.45, 7.50, 19.35, 21.10 Выбары-96.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00, 23.20 Весткі.
7.20 У гэты дзень...
7.30 Дзелавая Расія.
8.05 Прасцей простага.
8.35 Даміно Міхаіла Баярскага.
9.05--10.20 «Санта-Барбара».
13.50 Музычная легенда.
14.50 «Гладыятары».
15.45 Там-там навіны.
16.20 Расія ў тварах.
16.45 «Дзяўчынка з заўтра». Серыял для падлеткаў (Аўстралія).
17.15 «Дажджлівы дождж». Мультфільм.
17.30 «Твар з вокладкі». А. Апіна.
17.45 Свая гульня.
18.15 «Выбірай, а то прайграеш».
18.25 «Удалося». Відэафільм.
19.50 «Санта-Барбара».
20.40 Сам сабе рэжысёр.
21.25 Надвор'е на заўтра.
21.30 Футбол. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА.
23.35—0.27 «Брыльянты сусветнага балета» ў Дзяржаўным Крамлёўскім Палацы.

Расійскія універсітэты.

9.30 Выбары-96.
9.40 Да 600-годдзя з дня нараджэння. «Стэфан Пермскі. Па святых слядах». Дак. фільм.
10.30, 13.30, 16.45 СІВ. Навіны.
10.40 Мультфільм.
10.50 У аб'ектыве Германія.
11.20 Відэапаэзія. Зінаіда Гіпіус.
11.30 АНК прадстаўляе... У працоўны поўдзень.
12.00 «Барвовая трава». Маст. фільм.
12.30 Чалавек у рынкавай эканоміцы.
13.00 Спяваю для вас. Арганічная лэдзі.
13.10 Рускі жывапіс.
13.35 «Першы раман Міхаіла Булгакава». Дак. фільм.
13.45 Маленькі канцэрт.
14.00 Нямецкая мова.
14.30 Педагогіка для ўсіх.
15.00 Цвятаева і Ахматава: адну з табою мы зямлю топчам...
15.40 «Жостаўскі роспіс». Дак. фільм.
15.50 Выбары-96.
16.00 Музычныя навіны.
16.15 «Муззон».

НТБ

17.00 «Сямейка Флінстоўн». Мультсерыял.
17.30 «Багатая жанчына: утрымаць мару». 19-я серыя.
18.00, 21.00, 23.00 «Сёння».
18.35 Герой дня.
19.00 Маст. фільм «Грозны Джо Моран» (ЗША).
20.45 «ТЭФІ-96»: хто ёсць хто.
21.35 «Доктар Куін, жанчына-ўрач». 53-я серыя.
22.30 Часінка.
23.20 Чэмпіянат Расіі па спартыўных танцах.
23.50 Кафэ «Абломаў».

Санкт-Пецярбург

11.55, 12.55, 13.55, 14.55, 15.55, 17.55, 18.55, 19.55, 20.55, 21.55 Інфарм ТБ «Цяпер».
12.05 «Першае каханне». Серыял.
13.05 Тэрмін адказу — сёння.
13.35 Парады садаводам.
13.45, 20.35 Тэлеслужба бяспекі.
15.05 «Пятроўскі партрэт». Тэлефільм.
15.20 «Погляд на сёння».
16.05 Стыль жыцця.
16.10 «Тваіх агароджаў чыгунныя ўзоры». Тэлефільм.
16.20 «Нана». Серыял для дзяцей.
16.45 «Вялікія прыгоды Мэдса». Мультсерыял.
16.55 Спартыўны агляд.
17.05 Толькі без панікі.
17.30, 18.00 Паказвае Ленінградская АТК.
18.35 Вялікі фестываль.
19.05 «Першае каханне». Серыял.
20.05, 21.05 Выбіраем губернатара.
20.45 «Што наша жыццё...»
21.00 Спорт.
22.05 «На ноч гледзячы». Забаўляльная праграма.
22.20—23.41 «Гоя, ці Цяжкі шлях пазнання». Маст. фільм. 1-я серыя.

ФІРМА ПРАПАНУЕ ВЫСОКААПЛАТНУЮ РАБОТУ.
ТЭЛ. 37-97-22 ДА 13.00.

РОЗНАЕ

❑ Адбудзецца сустрэча 2 чэрвеня 1996 г. выпускнікоў 1981 г. Ільянскага саўгаса-тэхнікума 43-й групы заатэхнічнага аддзялення.

❑ Высокааплатная работа на даму. Заяўка з канвертам і зваротным адрасам па адрасу: 222620, г. Нясвіж, а/с 3.

❑ Шматгадовая праца над двухтомным прыгодніцкім творам амаль завершана. Ёсць недапрацоўкі, якія сам не адолею. Патрэбен усебакова адукаваны сааўтар. Адрас: 211800, г. Глыбокае Віцебскай вобл. УЖ-15/13-5. Аланаву Аляксандру.

ассоциация ЕВРООПТ
ТОВАРЫ устойчивого спроса
НОВЫЕ ПОСТУПЛЕНИЯ:
йогурты Südmilch (Германия)
чай Dilmah, Herbata
жевательная резинка (Испания), 20 видов
шоколадный батончик Lion
шоколад Kinder Chocolate
ОПТОМ и мелким ОПТОМ
Минск
К.Либкнехта 68, к.118
тел. (0172) 54-62-96
20-31-27, 20-08-90
© Гольфстрим

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Р